Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

Экстраны выпуск.

Нядзеля 6 лістапада 1927 г.

ДА УСІХ ПРАЦОЎНЫХ Б. С. С. Р.

Адозва Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

З ПРЫЧЫНЫ ДЗЕСЯТАЙ ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКАВАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

У працягу многіх вякоў Беларусь, знаходзячыся на рубяжы паміж панскай Польшчай і царскай Расеяй, пераносіла палітычнае, эканамічнае і нацыянальнае прыгнечаньне.

У Беларусі ў большай ступені, чым у іншых мясцох, насаджалася ўлада памешчыкаў, надавалася асаблівае значэньне ўладзе губарнатараў, прыставоў і жандараў. Памешчыкі ўладалі ў Беларусі вялізнымі землямі, у той час, як сялянства знаходзілася ў жабрацкім стане. Самаўладзтва нацкоўвала адну нацыянальнасьць супроць другой, каб адцягнуць гэтым працоўных ад клясавае і палітычнае барацьбы супроць капіталістых. Вынікамі такой палітыкі былі—страшэнная беднасьць і культурная адсталасьць масы гарадзкога пралетарыяту, рамесьніцтва і асабліва сялянства, неабмяжованая самачыннасьць памешчыка, чыноўніка і жандара, якія знаходзілі дзейнае і моцнае падтрыманьне з боку папоў, ксяндзоў, рабінаў і іншых служак розных рэлігій.

Бурным рэвалюцыйным парывам у Кастрычніку 1917 году рабочыя і сяляне Беларусі, пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі, разам з рабочымі і сялянамі ўсіх нацыянальнасьцяй старое Расеі, пайшлі на паўстаньне за рабочымі Петраграду і зьнішчылі ўладу памешчыкаў і капіталістых.

Так дзесяць год таму назад рабочыя і сяляне Беларусі, разам з працоўнымі Рэспублік, што ўваходзяць зараз у склад Вялікага Савецкага Саюзу, пахавалі стары лад і паклалі пачатак першай у сьвеце дзяржаве рабочых і сялян. Дзесяць год таму назад была зацьверджана, упяршыню, у сусьветнай гісторыі, дыктура пралетарыяту, як новая форма дзяржаўнасьці, заснаваная на саюзе рабочай клясы з працоўным сялянствам для барацьбы супроць капіталізму, за сацыялізм.

Кастрычнікавая рэвалюцыя зьмяла старыя клясавыя ўзаемаадносіны, зьнішчыла паліцэйска-бюракратычны рэжым, агаласіла раўнапраўе ўсіх нацый, якія-б маленькія яны ні былі, і палажыла ў аснову далейшага дзяржаўнага парадку прынцып самавызначэньня народаў. Беларусь, якая ў мінулым была абмяжована ў правах, як акраіна царскай Расеі, атрымала таксама, як і іншыя нацыі, права на стварэньне свае дзяржаўнасьці, утварыла Савецкую рабоча-сялянскую дзяржаву.

Але вялікая Кастрычнікавая Рэвалюцыя адбывалася на Беларусі ў цяжкіх умовах франтавога становішча. Імпэрыялізм кайзэраўскае Нямеччыны, які дажываў свае апошнія дні, ня лічыўся з яўна выражанай воляй працоўных Расеі да міру, і зграі Вільгэльма былі накіраваны ў глыбіню толькі што створаных Савецкіх Рэспублік, аднаўляючы ўсюды ўладу заможных клясаў. Беларусь была акупавана. Толькі дзякуючы ўпартай барацьбе рабочых і сялян Беларусі, пад кіраўніцтвам кампартыі, дапамозе Расейскай Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі, рэвалюцыі ў Нямеччыне,—Беларусь зноў стала свабоднай і магла прыступіць да замацаваньня савецкага ладу. 1-га студзеня 1919 году Беларусь была аглошана самастойнай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай.

Аднак, і пасьля гэтае мірнае будаўніцтва не магло распачацца ў шырокіх разьмерах. Узьнікшая ў выніку рэвалюцыйных бур Польская рэспубліка апынулася ў руках буйных памешчыкаў і капіталістых; пад іх уладаю Польшча стала служыць арудзьдзем сусьветнаму імпэрыялізму ў яго барацьбе з ненавіснай для буржуазеі савецкай уладай. Карыстаючыся слабасьцю Савецкіх Рэспублік, якія заняліся жорсткаю барацьбою за сваё існаваньне на шматлікіх франтох на поўначы, поўдні і ўсходзе, Польшча Пілсудзкага накіравала свае легіёны на Савецкую Літву і Беларусь.

Пачалася другая акупацыя, якая суправаджвалася нячуваным уціскам працоўнага насельніцтва, разбурэньнямі дзяржаўнае маемасьці, зьнішчэньнем савецкае ўлады, аднаўленьнем маемасных правоў памешчыкаў, насаджэньнем жандарска-паліцэйскага рэжыму.

Гэтаму прыгнечаньню і зьдзекам, якія нанаміналі горшыя часы царызму, палажыла канец наша гэраічная Чырвоная армія і рэвалюцыйная барацьба рабочых і сялян Беларусі. У 1920 годзе Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка зноў адрадзілася, хоць частка яе ранейшай тэрыторыі засталася па-за межамі Савецкіх Рэспублік.

У нязвычайна цяжкіх умовах пачалося мірнае будаўніцтва Савецкай Беларусі. Узьнікнуўшы ў агні жорсткай узброенай барацьбы, у непасрэднай блізкасьці фронту і пераждаўшы дзьве акупацыі, Беларуская ССР у першыя гады свайго існаваньня апынулася перад страшнейшай бядою і зруйнаваньнямі. Многія гарады і мястэчкі былі зруйнаваны, сёлы спалены, шляхі зносін паксаваны, сувязь зьнішчана. Масы насельніцтва паўцякалі з сваіх гаспадарак, палі не абрабляліся і знаходзіліся ў запушчадзе, прамысловыя прадпрыёмствы былі разбураны, або эвакуаваны, тыя-ж, што засталіся, не працавалі з прычыны недахвату сыравіны. Школы і больніцы былі разбураны і не маглі абслугоўваць насельніцтва. Уся тэрыторыя рэспублікі перапоўнена была белагвардзейскімі бандамі, якія сваімі разбойніцкімі ўчынкамі павялічвалі разбурэньні.

Дзяржаўны гэрб БССР.

Толькі вялізнымі сіламі рабочых і сялян, пад кіраўніцтвам рабоча-сялянскага ўраду і пры сталым падтрыманьні з боку Савецкага Саюзу, удалося спыніць, ліквідаваць гэтыя разбурэньні і павесьці гаспадарку па шляху аднаўленьня і разьвіцьця.

Да 10-й гадавіны Кастрычнікавай Рэвалюцыі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саветаў і Савет Народных Камісараў БССР з пачуцьцём глыбокага здавальненьня адзначаюць аднаўленьне народнае гаспадаркі Рэспублікі, якое поўнасьцю закончана, і пачатак новага пэрыяду ў сацыялістычным будаўніцтве—пэрыяду карэннай рэарганізацыі ўсяе гаспадаркі на новых больш удасканаленых асновах.

За мінулыя нямногія гады мірнага будаўніцтва Беларуская ССР узмацнілася ў палітычных і эканамічных адносінах, далёка пашла наперад па шляху культурна-нацыянальнага разьвіцьця. Тэрыторыя Рэспублікі з шасьці паветаў б. Менскай губ. пашырана ўключэньнем у яе зямель са складу Саюзу ССР, дзе беларускае насельніцтва складае большасьць. Праведзена адміністрацыйна-гаспадарчае раёнаваньне Рэспублікі, якое пацягнула за сабою ўзмацненьне савецкага будаўніцтва з павышэньнем ролі нізавых органаў савецкае ўлады і прыцягненьнем да справы савецкага будаўніцтва шырокіх рабоча-сялянскіх мас.

Гаспадарка Рэспублікі зрабіла такія посьпехі, якіх Беларусь не магла-б дабіцца пры ўладзе буржуазеі. Разбураная прамысловасьць поўнасьцю аднаўлена і ў сучасны момант прыступлена да арганізацыі новых буйных прадпрыёмстваў, па сваіх разьмерах і тэхнічным абсталяваньні далёка перасягаючых усё тое, што было створана да рэвалюцыі.

Сельская гаспадарка перасягнула даваенныя разьмеры ў сваёй вытворчасьці і ідзе шпаркім тэмпам па шляху разьвіцьця. Землеўпарадкаваньне і пераход на шматпольле ідзе гіганцкімі крокамі, вялізныя плошчы нявыгадных зямель, балот—упартаю працаю сялянства ператвараюцца ў добрыя сенажаці і пахату. Расьце таварнасьць сельскае гаспадаркі шляхам усё большага і большага разьвіцьця найбольш прыбытковых галін. Пад уплывам мерапрыёмстваў савецкае ўлады карэнным чынам замяняецца старая сыстэма сялянскае гаспадаркі. Горад і вёска ўзмоцнена перабудоўваецца. Будуюцца новыя камунальныя прадпрыёмствы, паляпшаецца дабрабыт, разьвіваецца рабочае кватэрнае будаўніцтва, адбудоўваецца пановаму і вёска.

З ростам усяе народнае гаспадаркі ўзьнімаецца і ўзровень дабрабыту працоўных. Заработная плата, якая не здавальняла ў пачатку эпохі мірнага будаўніцтва нават пражытковага мінімуму, даведзена зараз да разьмераў значна большых, чым даваенныя: прыбытковасьць сялянскае гаспадаркі значна павялічылася. Культурнае абслугоўваньне рабочых і сялян праз школу, хату-чытальню, клюбы і інш. зрабілася такім шырокім, што ў недалёкім будучым можна будзе ліквідаваць поўнасьцю няпісьменнасьць, увесьці абавязковае ўсеагульнае навучаньне. За кароткі прамежак часу савецкага будаўніцтва створана беларуская вышэйшая школа, арганізован шэраг навукова-дасьледчых устаноў. Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, Інстытут Беларускае Культуры і Навукова Дасьледчы Інстытут сельскай і лясной гаспадаркі імя Леніна—і ўсё гэта зьяўляецца дзяцьмі Кастрычніка, справаю рук беларускіх рабочых і сялян.

Пры дапамозе і падтрыманьні савецкай улады расьце і савецкая грамадзкасьць. Каапэрацыйны рух ахапіў усіх працоўных гораду, пашыраецца і расьце ён з году ў год у вёсцы. Органы савецкай улады, уцягваючы ў сваю дзейнасьць шырокія рабоча-сялянскія масы, стварылі вакол сябе магутны савецкі грамадзкі актыў.

Аднэй з найвялікшых задач, якія вырашаны Кастрычнікавай рэвалюцыяй, трэба лічыць нацыянальнае пытаньне. Старая Расея—турма народаў-ператварылася ў Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, дзе кожны народ адчувае сябе роўным і вольным, дзе сільнейшыя і больш культурныя народы дапамагаюць слабейшым у іх эканамічным і культурным разьвіцьці.

Савецкая Беларусь, як роўная частка, уваходзіць у склад Савецкага Саюзу, які на ўсім працягу мінулай барацьбы і працы дапамагаў Беларусі ў яе сацыялістычным будаўніцтве.

У мінулым у Беларусі нацыянальнае прыгнечаньне было асабліва цяжкім з боку расейскага ўраду: царызм падтрымліваў нацыянальныя ўпрэчкі, натраўліваў адну нацыянальнасьць на другую, арганізоўваў яўрэйскія пагромы і г. д.

Стаўшы савецкай дзяржавай, Беларусь зьнішчыла ўсе сьляды нацыянальнага прыгнечаньня, стала на шлях дапамогі раней прыгнечаным народам у іх гаспадарчым і культурным жыцьці.

Дэкляраваньне ўрадам дзяржаўнымі моваў беларускай, расейскай, яўрэйскай і польскай, разьвіцьцё сеткі нацыянальных школ, судоў, стварэньне нацыянальных сельскіх саветаў, надзяленьне зямлёй працоўных яўрэяў і інш. мерапрыёмствы — забясьпечылі шырокую магчымасьць кожнай нацыянальнасьці, якая пры царызьме была прыніжана і прыгнечана, прыняць сапраўдны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве дзяржавы.

Усе гэтыя дасягненьні ў справе гаспадарчага, культурнага і дзяржаўнага будаўніцтва магчымы былі толькі пры дыктатуры пралетарыяту, які пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, абапіраючыся на вясковую бедноту і ў саюзе з серадняцкімі пластамі вёскі, стварыў сваю рабоча-сялянскую савецкую ўладу. Толькі савецкая ўлада—улада саміх працоўных магла вывесьці краіну з хаосу разрухі на шлях шырокага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, толькі самі працоўныя, трымаючы ўладу ў сваіх руках, маглі абараніць свае клясавыя інтарэсы. Вось чаму ўрады так званай «Беларускай народнай рэспублікі», што ўзьнікалі ў пэрыяды нямецкай і польскай акупацыі ў Беларусі, былі зьмецены рэвалюцыйным гураганам, бо яны былі варожы рабочаму і селяніну.

Трывалая і моцная ўлада—толькі ўлада, створаная рукамі саміх працоўных.

Адзначаючы дасягненьні ў сацыялістычным будаўніцтве за мінулыя гады, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саветаў і Савет Народных Камісараў Беларускае ССР, напярэдадні 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі, лічыць неабходным зазначыць, што ў далейшым будаўніцтве працоўныя спаткаюць яшчэ значныя труднасьці. У справе нашага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва перад намі стаяць яшчэ труднасьці, створаныя вякамі беднасьці і адсталасьці нашае краіны, якія яшчэ не пераможаны і да гэтага часу.

Перабудова прамысловасьці, сельскае гаспадаркі, забесьпячэньне кватэрамі рабочых патрабуюць ад працоўных вялізнай напружанасьці. Разам з тым над краінай Саветаў усё больш і больш згушчаецца небясьпека новага ваеннага нападу з боку замежнай буржуазеі, у першую чаргу ангельскай. Сусьветны капіталізм ліхаманкава рыхтуецца зьнішчыць нашу працоўную дзяржаву, імкнецца абярнуць нас у калёніяльную краіну, эканамічна і палітычна падпарадкаваць нас капіталу.

Аднак гэтыя перашкоды і небясьпекі ня могуць і не павінны затрымаць нашага сацыялістычнага будаўніцтва, нашага імкненьня да далейшага ўзьняцьця дабрабыту працоўных. Згуртаваныя вакол Саветаў, ахопленыя адзінай агульнай думкай і імкненьнем да абароны заваёў вялікага Кастрычніка, усямерна ўзмацоўваючы нашу гаспадарку і Чырвоную армію, працоўныя БССР, разам з працоўнымі ўсіх савецкіх рэспублік, здолеюць выйсьці пераможнікамі з усіх будучых небясьпек і труднасьцяй, бо яны выйшлі пераможнікамі з барацьбы ў першыя гады існаваньня савецкае ўлады.

Напярэдадні 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР заклікаюць усіх працоўных да дружнай далейшай працы сацыялістычнага будаўніцтва, да далейшай абароны заваёў Кастрычніка.

Адзначаючы дзесяцігодзьдзе Кастрычнікавай рэвалюцыі, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі

ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Для ажыцьцяўленьня Маніфэсту Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік аб пераходзе рабочых фабрычна-заводзкіх прадпрыёмстваў з 8-мігадзіннага на 7-мігадзінны рабочы дзень, даручыць Вышэйшаму Савету Народнае Гаспадаркі і Народнаму Камісарыяту Працы БССР якнайхутчэй распачаць падрыхтоўчую працу на ўвядзеньні сямігадзіннага рабочага дня і канкрэтны плян ажыцьцяўленьня гэтага мерапрыёмства ў паасобных галінах прамысловасьці падаць на зацьверджаньне Савету Народных Камісараў БССР.

2. Для далейшага пашырэньня рабоча-жылішчнага і клюбнага будаўніцтва, даручыць Эканамічнай Нарадзе пры Савеце Народных Камісараў БССР пры разглядзе пляну рабоча-жылішчнага і клюбнага будаўніцтва павялічыць долю асыгнаваньняў на рабоча-жылішчнае і клюбнае будаўніцтва.

3. Для палепшаньня стану беспрацоўных павялічыць дапамогу для беспрацоўных груп кваліфікаванай працы да 20 проц. і пашырыць лік беспрацоўных, якія забясьпечваюцца дапамогаю.

4. На падставе Маніфэсту Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік за 15 кастрычніка 1927 году аб дадатковым зьніжэньні адзінага сельска-гаспадарчага падатку яшчэ з 10 проц. сялянскіх гаспадарак, аб прыняцьці на дзяржаўны кошт землеўпарадкаваньня ўсіх бядняцка-сялянскіх гаспадарак і незаможных гаспадарак сераднякоў, аб распачацьці забесьпячэньня за кошт дзяржавы састарэлых асоб з незаможных пластоў сялянства і аб ільготах для гарадзкой, сялянскай і местачковай беднаты:

а) даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў БССР даасыгнаваць сродкі на зьніжэньне сельска-гаспадарчага падатку ня менш як з 35 проц. сялянскіх гаспадарак;

б) даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў БССР разам з Народным Камісарыятам Земляробства БССР прадугледзіць дадатковае асыгнаваньне ў 1927-28 годзе сум на землеўпарадкаваньне і падаць на зацьверджаньне Савету Народных Камісараў БССР;

в) ускласьці на Народны Камісарыят Фінансаў БССР разам з Народным Камісарыятам Сацыяльнага Забясьпечаньня БССР апрацоўку праэкту закону аб распачацьці паступовага забясьпечаньня за кошт дзяржавы састарэлых асоб з незаможных пластоў сялянства з тым, каб памянёны закон быў пададзен на зацьверджаньне чарговага Усебеларускага Зьезду Саветаў;

г) запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў БССР і акруговым выканаўчым камітэтам БССР забясьпечыць сваячаснае выкананьне закону Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР за 4 лістапада 1927 году аб льготах, аб зьняцьці нядоімак, штрафаў і пені з сялянскай, гарадзкой і местачковай беднаты.

5. Даручыць Народнаму Камісарыяту Юстыцыі і Народнаму Камісарыяту Унутраных Спраў БССР на працягу месяца ажыцьцявіць пастанову Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік аб амністыі для адзначэньня дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

5 лістапада 1927 г.
г. Менск.

ДА ПРАЛЕТАРЫЯЎ УСІХ КРАЁЎ.

Адозва Чырвонага Прафінтэрну.

Кастрычнікавая рэвалюцыя ўліла сьвежыя сілы ва ўвесь міжнародны рабочы рух. У цэлым сьвеце няма гэткага краю, дзе рэвалюцыя, выбухшая 10 год назад у Расеі на выклікала-б сярод рабочых мас зацікаўленнасьць і сымпатыі.

Рабочыя ўсіх краёў! Вучыцеся на жывым прыкладзе Кастрычнікавае рэвалюцыі, як змагацца і перамагаць сваіх клясавых ворагаў. Абкружэце СССР сьцяною сымпатыі, падтрыманьня і памятайце, што міжнародны імпэрыялізм рыхтуе напад на СССР, каб зруйнаваць першую рабочую дзяржаву і гэтым самым адвучыць рабочых капіталістычных краёў ад замахаў на дыктатуру буржуазеі, ад спроб устанавіць шляхам рэвалюцыйнае барацьбы дыктатуру пралетарыяту.

Памятайце, што адбіць наступ міжнароднага капіталу можна толькі пры максымальнай аб'яднанасьці і аднаўленьнем баявога адзінства прафэсыянальнага руху ў нацыянальным і міжнародным абхваце.

Няхай міжнародная буржуазея рыхтуе змовы проці СССР, няхай міжнародны рэфармізм робіць паклёпы на першую рэспубліку працы. Усе сумленныя рабочыя будуць памятаць гістарычны дзень дзесяцігодзьдзя, сьвяткуемы рабочаю клясаю СССР. Яны будуюць тую рабочую дзяржаву, якая ў пэрыяд шалёнага наступу капіталу на элемэнтарныя заваёвы рабочае клясы капіталістычных краёў сама па сваёй ініцыятыве намячае пераход да сямігадзіннага рабочага дню і да далейшага павышэньня жыцьцёвага ўзроўню шырокіх працоўных мас.

Няхай жыве вялікая Кастрычнікавая рэвалюцыя.
Няхай жыве будаўнік сацыялізму—рабочая кляса СССР.

Пастанова Прэзыдыуму ЦВК СССР

АБ АМНІСТЫІ.

У выкананьне маніфэсту Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР ад 15 кастрычніка 1927 году і ў адзнаку 10 годзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР пастанаўляе:

1. Усім засуджаным да вышэйшае меры сацыяльнае абароны (растрэлу), за выключэньнем асоб, пазбаўленых амністыі арт. 10 маніфэсту Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР ад 15 кастрычніка 1927 г. па справах, па якіх прысуды яшчэ ня выкананы, замяніць растрэл 10 гадовым пазбаўленьнем волі з суровым адмежаваньнем і канфіскацыяй маемасьці.

2. Засуджаных судамі з пазбаўленьнем волі на тэрмін да 6 месяцаў уключна вызваліць зараз-жа ад трыманьня пад вартаю і ад іншых, зьвязаных з прысудамі, дадатковых мераў сацыяльнай абароны. Працоўных, чырвонаармейцаў і чырвонафлётцаў, засуджаных судамі ў першы раз да пазбаўленьня волі на тэрміны да 1 году ўключна, зараз-жа вызваліць ад трыманьня пад вартаю і ад усіх дадатковых мер сацыяльнай абароны.

3. Працоўных, засуджаных да пазбаўленьня волі на больш доўгія тэрміны, вызваліць ад далейшага трыманьня пад вартаю і дадатковых мер сацыяльнае абароны, калі яны засуджаны ў першы раз і адбылі палову тэрміну, назначанага судовымі прысудамі; тых з іх, якія не адбылі паловы тэрміну, вызваліць пасьля паловы адсідкі. Рэшту засуджаных да пазбаўленьня волі на больш доўгія тэрміны вызваліць ад далейшага трыманьня пад вартаю і дадатковых, зьвязаных з прысудамі мер сацыяльнае абароны, калі яны адбылі 2/3 назначанага судовымі прысудамі тэрміну.

Палёгкі, адзначаныя ў наступным артыкуле, не распаўсюджваюцца на актыўных членаў палітычных партый, ставячых сабе мэтаю зьнішчэньне савецкага ладу, а таксама і на асоб, засуджаных за злоснае хабарніцтва і злосныя растраты.

4. Вызваліць ад далейшага трыманьня пад вартаю ўсіх працоўных, засуджаных па прысудах судоў ці адміністрацыйных органаў за контр-рэвалюцыйную дзейнасьць, якая адбылася ў час грамадзянскае вайны да 1 студзеня 1923 году. Усе неакончаныя справы гэткага роду падлягаюць спыненьню. Выключэньне з гэтага разьдзелу можа мець месца толькі па пастанове Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР ці цэнтральных выканаўчых камітэтаў саюзных рэспублік.

5. Вызваліць ад адсідкі, у выглядзе дадатковае меры сацыяльнае абароны,—усіх працоўных, што вярнуліся з высылкі, засуджаных судом упяршыню і адбываючых асноўную меру сацыяльнае абароны, а таксама зьняць з засуджаных ускладзенае на іх умоўнае засуджаньне.

6. Адносна асоб, засуджаных органамі Аб'яднанае Дзяржаўнае Палітычнае Ўправы, апроч асоб, выключаных згодна арт. 10 маніфэсту з наступнай амністыі, спыніць далейшае ўжываньне вызначаных для іх мер сацыяльнае абароны, калі яны адбылі дзьве трэці ўстаноўленага для іх пастановаю Аб'яднанае Дзяржаўнае Палітычнае Ўправы тэрміну. Асоб, засуджаных органамі Аб'яднанае Дзяржаўнае Палітычнае Ўправы за дзяржаўныя злачынствы і ўзброены разбой, вызваліць, калі яны адбылі тры чвэрткі вызначанага прысудам тэрміну.

7. Зьняць са спэцыяльнага ўлічу ўсіх ранейшых афіцэраў і вайсковых чыноўнікаў белых армій.

8. Вызваліць ад прымусовае працы ўсіх грамадзян, засуджаных да гэтае меры сацыяльнае абароны ў адміністрацыйным ці судовым парадку.

9. Зьняць ускладзеныя ў судовым ці адміністрацыйным парадку і нявыплачаныя штрафы да 100 руб. уключна. Штрафы, ускладзеныя за нявыплату падаткаў, зьнімаюцца ў разьмеры і парадку, ужываемым пастановаю Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР ад 2 лістапада 1927 году „Аб зьняцьці нядоімак, штрафаў і пені па падатках і рэнце з незаможных гушчаў жыхарства“.

10. Адмяніць усякае пазбаўленьне ў правах для працоўных, якія засуджаны ўпяршыню, калі яны адбылі асноўную меру сацыяльнае абароны, ці былі дачасна вызвалены.

11. Адмяніць судзімасьць у адносінах да працоўных, засуджаных упяршыню і адбыўшых да дню выданьня гэтае пастановы аб амністыі асноўную меру сацыяльнае абароны, ці дачасна вызваленых, ці засуджаных да ўмоўнага зьняволеньня ці да прымусовае працы.

12. Спыніць усе судовыя справы аб злачынствах, учыненых працоўнымі ўпяршыню, за якія Крымінальнымі Кодэксамі саюзных рэспублік прадугледжана ў выглядзе меры сацыяльнае абароны абмежаваньне волі, ці прымусовая праца на тэрмін да 1 году. У адносінах-жа іншых грамадзян спыніць усе судовыя справы, па ўчыненых імі злачынствах, за якія прадугледжана абмежаваньне волі да 6-ці месяцаў, ці прымусовая праца на тэрмін да 6 месяцаў.

13. Гэтая пастанова падлягае ўжываньню судамі, ці адміністрацыйнымі органамі Саюзу ССР і саюзных рэспублік таксама па ўсіх справах аб злачынствах, учыненых да выданьня гэтае пастановы аб амністыі, прысуды па якіх яшчэ ня ўхвалены.

14. Ажыцьцяўленьне гэтае пастановы даручыць прэзыдыумам цэнтральных выканаўчых камітэтаў саюзных рэспублік праз падведамасьцьвенныя ім органы ў працягу месячнага тэрміну ад дню яго агалашэньня. У адносінах да спраў, падсудных судовым установам і адміністрацыйным органам Саюзу ССР тыя-ж абавязацельствы ўскласьці на Вярхоўны Суд і пракуратуру Вярхоўнага Суду Саюзу ССР і Аб'яднаную Дзяржаўную Палітычную Ўправу па прыналежнасьці.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР *М. Калінін.*

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР *М. Энукідзэ.*

Масква—Крэмль,
2-га лістапада 1927 году.

Пастанова Саюзнага ЦВК і СНК СССР

аб адмене нядоімак, штрафаў, пені па падатках і рэнты з маламоцных гушчаў жыхарства.

У разьвіцьцё арт.4-га Маніфэсту ЦВК СССР ад 15 кастрычніка 1927г. («Известия ЦИК СССР и ВЦИК» ад 16 кастрычніка 1927 г. № 238) ЦВК і СНК СССР пастанаўляюць:

1. Зьняць поўнасьцю нядоімкі, якія лічацца на 7 лістапада 1927 г.. штрафы і пені па падатках—прамысловым і на прыбытак, падатку з маемасьці, пераходзячае ў парадку спадчыны ці падарунку, гербавым зборы, судовых мытах, а таксама па скасаваных зараз агульнадзяржаўных падатках:

а) з асоб, якія да 7 лістапада 1927 г. працуюць па найме, ці зьяўляюцца дзяржаўнымі пэнсіянэрамі, калі яны ня маюць іншых, апроч заработку, пэнсіі і літаратурнага заработку, крыніц прыбытку;

б) з асоб, якія на 7 лістапада 1927 г. лічацца беспрацоўнымі, зарэгістраванымі на біржы працы;

в) з асоб, якія займаліся да 6 лістапада 1927 г. сельскай гаспадаркай, калі іх гаспадаркі ў 1927-28 акладным годзе поўнасьцю ці часткова вызвалены ад адзінага сельска-гаспадарчага падатку, як па неабкладаемым мінімуме, так і за кошт асноўнага і дадатковага фондаў і скідак водлуг арт. 33-35 палажэньня аб адзіным сельска-гаспадарчым падатку (Збор Законаў Саюзу ССР 1927 г., № 17 арт. 189) і пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР ад 21 кастрычніка 1927 г. аб дадатковых палёгках сялянству па адзіным сельска-гаспадарчым падатку („Известия ЦИК Союза ССР і ВЦИК" ад 22 кастрычніка 1927 г. № 243);

г) з інвалідаў працы і вайны, якія займаюцца саматужнымі і рамеснымі промысламі і гандлем, калі яны ў 1927-28 акладным годзе вызваляюцца поўнасьцю ці ў палавінным разьмеры ад прамысловага падатку, і калі прыбытак іх, абкладаемы па прыбытковых падатках у тым-жа акладным годзе, не перавышае неабкладаемага мінімуму ў два разы.

УВАГА 1: Саветам Народных Камісараў Саюзных Рэспублік надаецца права распаўсюджваць палёгкі, вызначаныя ў п. „а" гэт. артыкулу на рабочых, служачых і дзяржаўных пэнсіянэраў, якія маюць іншыя, апрача прадугледжаных гэтым пунктам, крыніцы прыбытку.

УВАГА 2: Гэты артыкул распаўсюджваецца на мясцовыя надбаўкі па вызначаных у ёй агульнадзяржаўных падатках.

2. Зьняць у палавінным разьмеры нядоімкі, якія лічацца на лістапад 1927 г. штрафы і пені па падатках, вызначаных у арт. 1 і па мясцовых надбаўках да іх з асоб, сродкам існаваньня якіх да 7 лістапада 1927 г. зьяўляецца ўзнагарода за ўласную працу, калі прыбытак іх, абкладаемы па прыбытковых падатках у 27-28 акладным годзе, не перавышае неабкладаемага мінімуму ў паўтара разы.

3. Зьняць поўнасьцю з асоб, вызначаных у артыкулах 1-м і 2-м, нядоімкі, якія лічацца на 7 лістапада 1927 г., а таксама штрафы і пені па выплаце асноўнае і дадатковае рэнты.

4. Даручыць Наркому Фінансаў Саюзу ССР выдаць у тыднёвы тэрмін інструкцыю па ўжываньні артыкулаў 1—3 гэтае пастановы.

5. Прапанаваць урадам Саюзных Рэспублік у тыднёвы тэрмін выдаць пастановы аб поўным ці частковым зьняцьці з незаможных гушчаў жыхарства нядоімкі, штрафы і пені па мясцовых падатках.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР *М. Калінін.*

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР *А. І. Рыкаў.*

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР *А. Энукідзэ.*

Масква—Крэмль.

2 лістапада 1927 г.

СССР адзіная ў сьвеце дзяржава, забясьпечваючая братэрскі саюз усіх нацыянальнасьцяў і поўную магчымасьць іх эканамічнага і культурнага разьвіцьця.

Пастанова Саюзнага ЦВК і СНК СССР

АБ ЗЬНЯЦЬЦІ З СЯЛЯНСТВА ЗАВІНАВАЧАНАСЬЦІ ПА ПАЗЫКАХ, ВЫДАДЗЕНЫХ У 1924-1925 БЮДЖЭТНЫМ ГОДЗЕ У ЗЬВЯЗКУ З НЕУРАДЖАЕМ.

У разьвіцьцё артыкулу 4-га Маніфэсту Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР ад 15-X—27 г. („Известия ЦИК Саюзу ССР и ВЦИК" ад 16-X—27 г. № 238) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляюць: зьняць з сялянскіх гаспадарак (адзінаасобных і калектыўных) усю завінавачанасьць на 7-е лістапада 1927 году, завінавачанасьць па пазыках, атрыманых у 1924-25 бюджэтным годзе з прычыны неўраджаю як з дзяржаўных сродкаў, так і з сродкаў сельска-гаспадарчых банкаў (цэнтральнага, рэспубліканскага і мясцовых).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР *М. КАЛІНІН.*

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР *А. І. РЫКАЎ.*

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР *А. ЭНУКІДЗЭ.*

Масква—Крэмль,
2-га лістапада 1927 г.

Усе перадавыя рабочыя---у партыю Леніна.

Пастанова ЦК УсеКП(б).

МАСКВА. Пастанова ЦК УсеКП(б) аб шырокім уцягваньні ў партыю рабочых і работніц у зьвязку з 10-й гадавінай Кастрычнікавай рэвалюцыі: ў ЦК УсеКП(б) паступаюць ад шэрагу арганізацый паведамленьні (Масква, Ленінград, Растоў, Баку і інш.), што ў зьвязку з 10-цігодзьдзем Кастрычнікавае рэвалюцыі выявілася ўзмоцненае імкненьне шырокіх гушчаў беспартыйных рабочых да ўваходу ў УсеКП(б).

Лічачы ўваход ва УсеКП(б) новых атрадаў рабочае клясы фактам вялічэзнае важнасьці як у сэнсе павялічэньня сувязі партыі з рабочымі масамі, так і ў сэнсе ўзмацненьня кіруючае ролі пралетарыяту ў сацыялістычным будаўніцтве, ЦК УсеКП(б) пастанаўляе: 1) адобрыць прапанову мясцовых парторганізацый аб шырокім уцягваньні ў партыю рабочых і работніц у дні адзнакі 10-цігодзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі з тым, каб галоўная ўвага была накіравана на прыняцьце ў партыю актывістаў-рабочых і актывістак-работніц, у тым ліку рабочых і камсамольцаў, якія ўдзельнічаюць у працы саветаў, прафэсыянальных саюзаў, вытворчых нарад, кааперацыі, культурных арганізацый і дабрахвотных таварыстваў; 2) лёзунгам шырокага прыёму рабочых і работніц у партыю павінна быць: усе перадавыя рабочыя і работніцы—ў партыю Леніна, пад сьцяг барацьбы за поўную перамогу Кастрычніка, поўную перамогу сацыялізму.

Беларусь у змаганьні за Саветы.

БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА І ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ.—ЯК ВЫРАШАЮЦЦА Ў ПОЛЬШЧЫ БЕЛАРУСКІЯ СПРАВЫ.—ВЫЗВАЛЕНЬНЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ З-ПАД ПАНСКАГА ЎЦІСКУ—ІДЭАЛ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН БЕЛАРУСІ.

Кастрычнікавая рэвалюцыя 1917 г. абхапіла сабою спачатку толькі частку Беларусі—на усход ад Дняпра. Толькі ў канцы кастрычніка 1918 г. савецкае войска, а за ім і рабоча-сялянская савецкая ўлада сталі ваяваць тэрыторыі Беларусі на захад ад Дняпра ўслед за адступаўшымі немцамі. 28 кастрычніка 1918 г. савецкая ўлада ўвайшла ў Магілеў, 10 сьнежня яна была ў Менску, а 5 студзеня 1919 г.—ужо ў Вільні.

У гэты прыблізна час савецкае войска заняло амаль ня ўсю Зах. Беларусь і ўстанавіла ў ёй уладу рабочых і сялян з цэнтрам у Вільні, дзе знаходзіўся Савет Нар. Камісараў Літоўска-Белар. Сац. Сав. Рэспублікі, ці карацей—Літбел.

Перамога рабочых і сялян над контррэвалюцыйнымі арміямі расейскіх генэралаў, падтрымліваных Антантай з аднаго боку, скорае і разумнае зьліквідаваньне нацыянальных пытаньняў у адносінах да народаў б. царскай Расеі, якія заявілі свае правы на поўнае аддзяленьне ад РСФСР—з другога боку,— больш усяго непакоіла панскую Польшчу.

Польскае панства, слаўнае сваімі старадаўнымі абшарніцкімі традыцыямі, не зраклося думкі аб Польшчы «ад мора да мора». Яму хацелася відзець Польшчу не этнаграфічную, а вялікую, у склад якой уваходзілі-б і Літва, і Беларусь, і Украіна, і частка Латвіі, і Усходняя Прусія і г. д., г. ё. даўтуль, дзе ёсьць хоць адзін польскі мадзёнтак.

Чорнасоценная частка польскіх колаў лічыла, што гэтыя тэрыторыі трэба проста заваяваць і далучыць да войска захоўвалася ў адносінах да мясцовай люднасьці надзвычайна дрэнна. Рэзультатам такой палітыкі было тое, што нават тыя беларусы, якія паверылі было ў федэрацыйныя і дэмакратычныя пераканаьні Пілсудскага, сталі ад яго адхадзіць. Народ стаў ненавідзець польскае войска і адміністрацыю.

Калі польскае войска стала ў 1920 годзе адыходзіць з абшараў Беларусі, дык нават каталіцкія вёскі падымаліся проці белапалякаў, рабілі на іх партызанскія напады і дапамагалі савецкім войскам.

Гэтым насяленьне Зах. Беларусі дало ясны выраз сваім сымпатыям і антыпатыям. Яно пераканалася—за кароткі тэрмін панаваньня белапольскай улады, што яна з сабой нясе для мясцовай людзкасьці ўладу пана-абшарніка, самавольства жандармэрыі, паліцыі, шпікоў і ўрадоўцаў, поўную ненавісьць да ўсяго мясцовага, злодзействы, зьдзекі, катаваньні, астрогі, біцьцё, забойствы і г. д.

Таму вусім зразумелай зьяўлялася тая прыхільнасьць нашых работнікаў і сялян, з якою яны сустракалі ў 1920 г. паўторны прыход савецкай улады.

Ад панскага польскага панаваньня, якое так уселася ў косьці нашага сялянства, ў адзін момант не засталося ані сьледу. Заходняя Беларусь вітала савецкія войскі, вітала ўладу рабочых і сялян, аб сутнасьці якой, ня гледзячы на варожую агітацыю, што быццам з імі ізноў прыходзіць на абшары Заходняй Беларусі панаваньне самаўладнай Масквы і г. д., яна чула, маедаў-паноў іх землі і аддала-б іх - ня выхадцам з Галіцыі і Познані,—а тутэйшым бяднейшым сялянам і работнікам.

ШКОЛЬНАЕ ПЫТАНЬНЕ ў абшарніцка-ксяндзоўскай Польшчы вырашана ў тым сэнсе, што на тэрыторыі Зах. Беларусі амаль зусім няма беларускіх школ. Ад тых 300-400 беларускіх школ, якія былі заложаны на тэрыторыі Зах. Беларусі яшчэ ў часе нямецкай акупацыі, цяпер не засталося амаль нічога. Толькі ў гэтым годзе ўрад Пілсудскага раздабрыўся адчыніць у Зах. Беларусі некалькі беларускіх школаў і некалькі польска-беларускіх. Што гэта будуць за школы—пакуль што невядома. Вядома толькі, што настаўнікамі ў іх будуць палякі, якія слаба або зусім ня ведаюць беларускай мовы і ня любяць мясцовай людзкасьці. Можна з пэўнасьцю сказаць, што падобныя школьная палітыка зьяўляецца новым зьдзекам над элемэнтарнымі патрэбамі і вымаганьнямі беларусоў, якія злажылі ўжо тысячы заяў аб адчыненьні беларускіх школ, а польскі ўрад і ня думае іх задаволіць.

Польскай школы нашае сялянства ня любіць і кляне, асабліва калі ў ёй настаўнік чужынец, які ня любіць Заходняй Беларусі і яе дзетак. Гэта—найгоршыя польскія пэдагогі, якім няма мейсца ў Польшчы, дык іх выкідаюць на «крэсы».

А кольскі нашых настаўнікаў і наогул інтэлігэнтаў сядзяць цяпер у Польшчы бяз усякай працы па культурна-асьветнай справе па вёсках у курных і цесных сялянскіх хатах і прымушаны жыць ад працы сваіх рук на полі ці ў лесе?

Гінуць і прападаюць гэтыя сілы, а навакол расьце дзетвара, ня вучыцца, дзічэе...

Савецкая сыстэма, наадварот, зацікаўлена ў тым, каб кожны народ меў сваю родную школу і таму ня толькі ня ставіць разьвіццю нацыянальнай культуры ніякіх перашкод, а яшчэ робіць УСЁ МАГЧЫМАЕ, КАБ ДАПАМАГЧЫ СЛАБЕЙШЫМ ПА КУЛЬТУРЫ НАЦЫЯМ У ІХ РАЗЬВІЦЬЦІ.

Урэшце закранём яшчэ некалькі пытаньняў, як, напрыклад: справу бел. друку, польскай адміністрацыі, войска, каапэрацыі, судоў і г. д.

У Зах. Беларусі ёсьць некалькі бел. газэт, якія выходзяць 1-2 разы ў тыдзень. Адміністрацыя амаль не рэгулярна **зачыняе** радыкальныя бел. газэты і **субсыдыруе** прадажніцкія бел. газ. Падручнікі і кніжкі ў Зах. Беларусі амаль зусім не выдаюцца, бо польскі ўрад **не дае на гэта грошай.**

У нас выдаецца шмат беларускіх і на інш. мовах газэт, часопісаў, кніжак, падручнікаў і г. д. І ўсё гэта робіцца, дзякуючы Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Што можна сказаць аб **польскай адміністрацыі і польскай паліцыі** ў Зах. Беларусі? **Іх маральнае аблічча** стаіць у вачох ня толькі зах. беларусоў, а і саміх палякаў так нізка, што далей няма куды ісьці.

Насяленьне Зах. Беларусі існуе, па думцы польскай адміністрацыі, для таго, каб падстаўляць свае сківіцы пад аплявухі польскага паліцыянта, каб вываручаць кішэні кожнаму польскаму ўраднаўцу, каб нізка кланяцца і цалаваць рукі, а бывае і ногі, кожнаму польскаму пану і г. д.

Польская адміністрацыя, асабліва-ж паліцыя, жандармэрыя і шпікі, самі зьяўляюцца ў многіх выпадках крыніцай розных крымінальных выпадкаў.

Выпадкі дзёшаў, раненьняў і забойстваў адміністрацыяй нашых сялян і рабочых бываюць досыць часта, але вышэйшая ўлада пакрывае іх і нават бывае так, што вінавайца ня толькі ня церпіць, а яшчэ павышаецца па службе, як патрыёт і герой.

Такіх выпадкаў не пералічыць.

Войска ў Польшчы, наскрозь прапітанага мілітарызмам, зашмат. Гэта паказвае, што Польшча хоча вайны, а ня міру. Вайсковы бюджэт заразае Польшчу. Яна траціць на войска ад 30 да 40 проц., а на асьвету 12-15. Адносіны польскага войска, раскватараванага ў значным ліку на нашым паграніччы, да беларускай людзкасьці—найгоршыя. Разбой, крадзеж і розныя насыльствы зьяўляюцца звычайным зьявішчам.

Польская адміністрацыя і войска лажацца надзвычайным цяжарам на Зах. Беларусь.

Так званыя—**самаўрады** ў Зах. Беларусі да апошняга часу знаходзіліся ў руках назначаных адміністрацыяй панскіх прыхвасьняў. Гэтым летам адбыліся перавыбары самаўрадаў і, ня гледзячы на рэпрэсіі адміністрацыі, выбары далі перамогу беларусам.

Каапэрацыя, якая пачала было шпарка расьці ў Зах. Беларусі ў 1919 годзе, цяпер амаль зусім зьліквідавана, а беларускія каапэратары ці сядзяць у вастрозе, ці ня могуць працаваць.

Суды ў Зах. Беларусі карыстаюцца старымі царскімі законамі, якія для «дэмакратычнай» Польшчы, як відаць, аказаліся занадта лібэральнымі. Суды ў Польшчы адбываюцца цяпер бяз удзелу прысяжных пасядацеляў. І вельмі часта носяць характар расправы з палітычнымі і нацыянальнымі імкненьнямі беларусаў.

Мінаючы некаторыя іншыя справы, за недахватам мейсц, я ўрэшце выказваю ўпэнэнасьць, што **Зах. Беларусь, стогнучая пад цяжкім панскім ярмом, ніколі не перастане змагацца за сваё вызваленьне**, за свой кастрычнік, які толькі і пазбавіць яе ад панскага ўціску і прынясе магчымасьць **рабоча-сялянскага будаўніцтва.**

М. КАХАНОВІЧ,
б. пасол польскага сойму.

Міжнародны характар Кастрычнікавае рэвалюцыі.

(Артыкул тав. Сталіна).

Кастрычнікавая рэвалюцыя ня толькі рэвалюцыя «ў нацыяналаных рамках». Яна перш за ўсё рэвалюцыя інтэрнацыянальнага сусьветнага парадку, бо яна зрабіла каранны паварот у сусьветнай гісторыі чалавецтва ад старога капіталістычнага сьвету да новага сацыялістычнага сьвету.

Рэвалюцыі ў мінулым канчаліся звычайнаю зьменаю ў апараце кіраўніцтва аднае групы эксплёататараў другою групаю эксплёататараў. Эксплёататары мяняліся, а эксплёатацыя заставалася. Так стаяла справа ў час вызваленчага руху нявольнікаў. Так было ў час паўстаньняў прыгонных. Так было ў час вядомых „вялікіх" рэвалюцый Англіі, Францыі, Нямеччыны. Я не кажу аб Парыскай Камуне, якая была першаю славутаю, гераічнаю, але беспасьпяховаю спробаю пралетарыяту павярнуць гісторыю проці капіталізму.

Кастрычнікавая рэвалюцыя адрозьніваецца ад гэтых рэвалюцый прынцыпова. Яна ставіць сваёй мэтай ня зьмену аднае формы эксплёатацыі другою формаю эксплёатацыі, аднае групы эксплёататараў другою групаю эксплёататараў, але зьнішчэньне ўсякае эксплёатацыі чалавека чалавекам, зьнішчэньне ўсіх і ўсякіх эксплёататарскіх груповак, устанаўленьня дыктатуры пралетарыяту, устанаўленьне ўлады самае рэвалюцыйнае клясы. З усіх існуючых да гэтага часу прыгнечаных клясаў,—арганізацыю новае бясклясавае грамады.

Уласна таму перамога Кастрычнікавае рэвалюцыі азначае каранны пералом у гісторыі чалавецтва, каранны пералом у гістарычным лёсе сусьветнага капіталізму, каранны пералом у вызваленчым руху сусьветнага пралетарыяту, каранны пералом у спосабах барацьбы і формах арганізацыі быту, у традыцыях, культуры і ідэалёгіі эксплёатуемых мас усяго сьвету.

У гэтым аснова таго, што **Кастрычнікавая рэвалюцыя ёсьць рэвалюцыя інтэрнацыянальнага сусьветнага парадку.**

У гэтым корань тае глыбокае сымпатыі, якую маюць да Кастрычнікавае рэвалюцыі прыгнечаныя клясы ўсіх краёў, бачачы ў ёй паруку свайго вызваленьня.

Трэба было-б адзначыць шэраг аснаўных пытаньняў, на лініі якіх праходзіць уплыў Кастрычнікавае рэвалюцыі на разьвіцьцё рэвалюцыйнага руху ва ўсім сьвеце.

Кастрычнікавая рэвалюцыя адзначаецца тым, што яна **прарвала фронт сусьветнага імпэрыялізму, зьнішчыла імпэрыялістычную буржуазею аднаго з самых вялікіх імпэрыялістычных краёў, перадала ўладу сацыялістычнай клясе. Кляса наймітаў, кляса прыгнечаных і эксплёатуемых упяршыню ў гісторыі чалавецтва ўзьнялася да становішча клясы пануючае, падаючы прыклад пралетарыяту ўсіх краёў.**

Гэта значыць, што **Кастрычнікавая рэвалюцыя распачала новую эпоху пралетарскіх рэвалюцый ў краёх імпэрыялізму.** Яна адабрала сродкі вытворчасьці ў магнатаў і капіталістаў і зрабіла іх грамадзкаю ўласнасьцю, пропіставіўшы такім парадкам буржуазнай уласнасьці ўласнасьць сацыялістычную.

Гэтым самым яна выкрыла ману капіталістаў аб тым, што буржуазная ўласнасьць зьяўляецца недатыкальнаю, сьвяшчэннаю і вечнаю. Яна вырвала ўладу ў буржуазеі, пазбавіўшы яе палітычных правоў, зруйнавала буржуазны дзяржаўны апарат і перадала ўладу саветам, проціпастаўляючы, такім чынам, буржуазнаму парлямантарызму, як дэмакратыі капіталістычнай, **сацыялістычную ўладу Саветаў, як дэмакратыю, пралетарскую.** Ляфарг казаў праўду, калі гаварыў яшчэ ў 1887 г., што на другі дзень пасьля рэвалюцыі «усе ранейшыя капіталісты будуць пазбаўлены выбарчых правоў». Гэтым самым Кастрычнікавая рэвалюцыя выкрыла ману сацыялістаў, якія абманваюць рабочых гутаркамі, што магчым мірны пераход да сацыялізму праз буржуазны парлямантарызм.

Але Кастрычнікавая рэвалюцыя ня спынілася і не магла на гэтым спыніцца. Зьнішчыўшы старое буржуазнае, яна прыняла ўладу і пачала будаваць новае—сацыялізм.

10 год Кастрычнікавай рэвалюцыі ёсьць дзесяць год будаўніцтва партыі, прафсаюзаў, саветаў, каапэрацыі, культурных арганізацый, транспарту, прамысловасьці, Чырвонае арміі. Бясспрэчныя посьпехі сацыялізму СССР на фронце будаўніцтва яскрава паказалі, што пралетарыят з посьпехам можа кіраваць краем без буржуазеі проці буржуазеі, што ён з посьпехам можа будаваць прамысловасьць без буржуазеі проці буржуазеі, кіраваць усёй народнай гаспадаркай без буржуазеі проці буржуазеі і з посьпехам будаваць сацыялізм, не зважаючы на капіталістычнае абкружэньне. Старая «тэорыя» аб ты, што эксплёатуемыя ня могуць абысьціся без эксплёататараў, таксама, як галава і часткі цела ня могуць абысьціся без жывата, не зьяўляецца ўласнасьцю толькі вядомага рымскага сэнатара старажытнае гісторыі. Гэтая «тэорыя» зьяўляецца зараз асноваю палітычнае «філёзофіі» сацыял-дэмакратыі і наогул сацыял-дэмакратычнае палітыкі кааліцыі з імпэрыялістычнаю буржуазеяю. Гэтая «тэорыя», якая набыла характар забабону, **зьяўлялася адною з самых сур'ёзных пешкод на шляху рэвалюцыянаваньня пралетарыяту капіталіатычных краёў.** Адным з найбольш важных вынікаў Кастрычнікавай рэвалюцыі зьяўляецца той факт, што яна нанесла гэтай фальшывай «тэорыі» сьмяротны ўдар.



Ці патрэбны яшчэ доказы таго, што **вынікі Кастрычнікавае рэвалюцыі зробяць сур'ёзны ўплыў на рэвалюцыйны рух рабочае клясы капіталістычных краёў?** Такія ўсім вядомыя факты, як наступацельны рост камунізму ў капіталістычных краёх, узрастаньне сымпатыі пралетарыяў усіх краёў да рабочае клясы СССР, урэшце, наплыў рабочых дэлегацый ў край Саветаў—усё гэта бясспрэчна гаворыць аб тым, што **зерне, кінутае Кастрычнікавай рэвалюцыяй, ужо пачынае даваць вынікі.**

Другое. Кастрычнікавая рэвалюцыя расхістала імпэрыялізм ня толькі ў асяродках яго панаваньня, ня толькі ў «мэтраполіях». Яна ўдарыла яшчэ ў тыл імпэрыялізму, яго пэрыфэрыю і падарвала панаваньне імпэрыялізму ў калёніяльных і залежных краёх.

Скінуўшы абшарніка-капіталістаў, Кастрычнікавая рэвалюцыя парвала ланцуг нацыянальнага калёніяльнага ўціску і вызваліла ад яго ўсе бяз выключэньня прыгнечаныя народы былш. царскае Расеі. Пралетарыят ня можа вызваліць сябе, не вызваляючы прыгнечаных нацыі. Характэрным фактам Кастрычнікавай рэвалюцыі зьяўляецца тое, што **яна правяла ў СССР гэтыя нацыянальна-калёніяльныя рэвалюцыі не пад сьцягам нацыянальнае варожасьці і міжнацыянальных стачак, але пад сьцягам узаемнага дазор'я і братэрскага зьбліжэньня рабочых і сялян розных нацыянальнасьцяў цяперашняга СССР ня ў імя нацыяналізму, а ў імя інтэрнацыяналізму.**

Іменна таму, што нацыянальныя і калёніяльныя рэвалюцыі адбыліся пад кіраўніцтвам пралетарыяту, пад сьцягам інтэрнацыяналізму, іменна таму—**народы-нявольнікі ўпяршыню ў гісторыі чалавецтва ўзьняліся да становішча вольных народаў, заражаючы сваім прыкладам прыгнечаныя народы ўсяго сьвету.** Гэта адначас, што **Кастрычнікавая рэвалюцыя адчыніла новую эпоху калёніяльных рэвалюцый,** якія праводзяцца ў прыгнечаных краёх сьвету ў саюзе з пралетарыятам і пад яго кіраўніцтвам.

Раней «прынята было думаць», што сьвет падзелен здаўна на ніжэйшыя і вышэйшыя расы, на чорныя і белых, з якіх першыя пяздольны да цывілізацыі і прызначаны быць абъектам эксплёатацыі, а другія зьяўляюцца адзінымі прадстаўнікамі цывілізацыі, закліканымі эксплёатаваць чорных.

Цяпер гэтую лягенду трэба лічыць разьбітаю, адхільнаю. Адным з значнейшых вынікаў Кастрычнікавае рэвалюцыі зьяўляецца той факт, што **яна нанесла гэтай лягендзе сьмяротны ўдар.** паказаўшы на справе, што вызваленыя неэўрапейскія народы, уцягнутыя ў логава савецкага разьвіцьця, здольны сапраўды пасунуць наперад перадавую культуру, перадавую цывілізацыю, зусім ня менш, чымся народы эўрапейскія.

Раней «прынята было» думаць, што адзіным мэтадам вызваленьня прыгнечаных народаў зьяўляецца мэтад буржуазнага нацыяналізму, аддаленьня аднаго ад другога, мэтад іх надзяленьня і ўзмацненьня нацыянальнае варожасьці між працоўнымі масамі розных нацый.

Цяпер гэтую лягенду трэба лічыць адхілепаю. Адным з важнейшых вынікаў Кастрычнікавае рэвалюцыі зьяўляецца той факт што **яна нанесла гэтай лягендзе сьмяротны ўдар.** Паказаўшы на справе магчымасьць і мэтазгоднасьць пралетарскага інтэрнацыянальнага мэтаду вызваленьня прыгнечаных народаў, як адзінага правільнага мэтаду, паказаўшы на справе **магчымасьць і мэтазгоднасьць братэрскага саюзу рабочых і сялян самых розных народаў на пачатках добрахвотнасьці і інтэрнацыяналізму.** Існаваньне Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, якое зьяўляецца ўзорам будучага аб'яднаньня працоўных усіх краёў у адзінай сусьветнай гаспадарцы, служыць таму простым доказам.

Няма чаго і казаць, што **гэтыя і падобныя ім вынікі Кастрычнікавае Рэвалюцыі не маглі і ня могуць заставацца бяз сур'ёзнага ўплыву на рэвалюцыйныя рух калёніяльных і залежных краёў.** Гэткія факты, як рост рэвалюцыйнага руху прыгнечаных народаў Кітаю, Інданэзіі, Індыі і г. д. павялічэньне сымпатыі гэтых народаў да СССР, блізкоўна гаворыць аб гэтым.

Эра неабмежаванае эксплёатацыі і прыгнечаньня калёній залежных краёў мінула.

Настала эра вызваленчых рэвалюцый у калёніях і залежных краёх, эра абудж эньня пралетарыяту гэтых краёў, эра яго гегемоніі ў рэвалюцыі.

Кіпуўшы пасеньне рэвалюцыі як у асяродак імпэрыялізму, так і ў яго тыл, паслабіўшы магутнасьць імпэрыялізму ў «мэтраполіях» пахіснуўшы яго панаваньне ў калёніях, **Кастрычнікавая рэвалюцыя паставіла тым самым пад пытаньне само існаваньне самога капіталізму ў цэлым.**

Калі стыхійнае разьвіцьцё капіталізму ва ўмовах імпэрыялізму перарасло з прычыны яго нераўнамернасьці, з прычыны няўхільнасьці канфліктаў і ваенных стычак, урэшце з прычыны нячуванае імпэрыялістычнае бойні у працэс «загніваньня» і «адміраньня» капіталізму, дык Кастрычнікавая рэвалюцыя і зьвязанае з ёю адлучэньне вялізнага краю ад сусьветнае сыстэмы капіталізму не маглі не паскорыць гэтага працэсу, надмываючы крок за крокам самыя асновы сусьветнага імпэрыялізму.

Больш таго расхістаўшы імпэрыялізм, **Кастрычнікавая рэвалюцыя стварыла** разам з тым у асобе першае пралетарскае дыктатуры **магутную адкрытую базу сусьветнага рэвалюцыйнага руху,** якой ён ня меў раней, і на якую ён мог цяпер абапірацца. Яна заснавала той магутны адкрыты цэнтр сусьветнага рэвалюцыйнага руху, якога ён ня меў ніколі раней і навакол якога ён можа цяпер аб'яднацца, арганізуючы адзіны рэвалюцыйны фронт пралетарыяў і прыгнечаных народаў усіх краёў проці імпэрыялізму.

Гэта значыць, што **Кастрычнікавая рэвалюцыя нанесла сусьветнаму капіталізму сьмяротную рану,** ад якой ён ніколі не аправіцца. Уласна таму капіталізм ніколі больш ня верне сабе тае «раўнавагі», тае «устойлівасьці», якія ён меў да Кастрычніка. Капіталізм можа часткова стабілізавацца. Ён можа рацыяналізаваць сваю вытворчасьць, аддаць кіраўніцтва краем фашызму, уціскаць часова рабочую клясу, але ён ніколі ня верне сабе «тае роўнавагі», тае «устойлівасьці», таго «спакою», тае «перакананасьці», якія ён меў раней, бо крызіс сусьветнага капіталізму дайшоў да такое меры разьвіцьця, калі агні рэвалюцыі ніяўхільна павінны вырвацца то ў цэнтрах капіталізму, то на пэрыфэрыі, набліжаючы з кожным днём скасавань не капіталізму. Якраз як у вядомай байцы: хвост выцягне,—нос увязьне, нос выцягне,—хвост увязьне.

Гэта значыць, папершае, што Кастрычнікавая рэвалюцыя ўзьняла на поўную вышыню моц, удзельную вагу, гераічнасьць, баявую гатоўнаьць прыгнечаных клясаў усяго сьвету, прымушаючы пануючыя клясы лічыцца з імі, як з новым сур'ёзным фактарам.

Цяпер ужо нельга разглядаць працоўныя масы сьвету, як левую групу, якая блудзіць у надзёмках, пазбаўленую пэрспэктывы, бо Кастрычнікавая рэвалюцыя заснавала для іх маяк, які асьвятляе ім шлях, даючы пэрспэктывы. Калі ня было раней усясьветнага адкрытага форуму, адкуль можна было-бы дэманстраваць і афарміляць усе імкненьні прыгнечаных клясаў, дык цяпер такі форум мы маем у асобе пралетарскае дыктатуры. Можна быць перакананым, што зьнішчэньне гэтага форуму пакрые на доўгі час грамадзка-палітычнае жыцьцё «перадавых краёў» цемрай безнадзейнае, чорнае рэакцы.

Нельга адхіляць таго, што нават **просты факт існаваньня „бальшавіцкае дзяржавы" стрымлівае чорныя сілы рэакцыі, паляючым прыгнечаным клясам барацьбу за сваё вызваленьне.** Гэтым уласна тлумачыцца тая страшэнная нянавісьць, якую адчуваюць эксплёататары ўсіх краёў да бальшавікоў. Гісторыя паўтараецца, хоць на новай аснове. Як раней, у пэрыяд падзеньня фэадалізму слова «якобінец» выклікала ў арыстакратаў агіду, так цяпер у пэрыяд падзеньня капіталізму слова «бальшавік» выклікае ў буржуазных краёх агіду і жах.

Наадварот, як раней Парыж зьяўляўся прытулкам і школаю для рэвалюцыйных прадстаўнікоў буржуазеі, так цяпер Масква зьяўляецца прытулкам і школаю для рэвалюцыйных прадстаўнікоў пралетарыяту. Нянавісьць да якабінцаў ня выратавала фэадалізм ад падзеньня; можна быць перакананымі ў тым, што нянавісьць да бальшавікоў ня выратуе капіталізм ад яго няўхільнага разгрому. Эра «устойлівасьці» капіталізму мінула і разам з ёю вынікла лягенда непарушанасьці буржуазных парадкаў.

Настала эра крушэньня капіталізму.

Кастрычнікавая рэвалюцыя ня ёсьць толькі рэвалюцыя ў галіне эканамічных і грамадзка-палітычных адносін. Гэта ёсьць разам з тым рэвалюцыя ў розумах, рэвалюцыя ў ідэалёгіі рабочае клясы. Кастрычнікавая рэвалюцыя нарадзілася і ўмацавалася пад сьцягам ленінізму, які ёсьць марксызм эпохі імпэрыялізму і пралетарскіх рэвалюцый. Яна аьяўляецца загэтым перамогаю марксызму над рэфармізмам.

Кастрычнікавая рэвалюцыя правяла баразну між марксызмам і сацыял-дэмакратызмам, між палітыкаю Леніна і сацыял-демакратызмам. Раней да перамогі дыктатуры пралетарыяту сацыял-дэмакратыя магла хваліцца сьцягам марксызму, не адхіляючы адкрыта ідэі дыктатуры пралетарыяту, але ня ўжы ваючы ніякіх крокаў, каб наблізіць ажыцьцяўленьне гэтае ідэі, бо такія паводзіны сацыял-дэмакратыі не стваралі ніякае пагрозы для капіталізму.

Тады, у той пэрыяд, сацыял-дэмакратыя фармальна зьліваласа, ці амаль зьліваласа з марксызмам. Зараз пасьля перамогі дыктатуры пралетарыяту ўсе ўбачылі, да чаго вядзе марксызм, што можа азначаць яго перамога, і сацыял-дэмакратыя ўжо не магла хваліцца сьцягам марксызму, не магла какетаваць з ідэяй дыктатуры пралетарыяту, не стваральі небясьпекі для капіталізму. Даўно парваўшы з марксызмам яна прымушана была парваць і са сьцягам марксызму і ішла адкрыта проці Кастрычнікавай рэвалюцыі, проці першае ў сьвеце дыктатуры пралетарыяту. Зараз яна павінна была адмежавацца ад марксызму, бо **нельга пры сучасных умовах зваць сябе марксыстам, не падтрымліваючы адкрыта першую ў сьвеце пралетарскую дыктатуру,** не праводзячы рэвалюцыйнае барацьбы проці сваёй буржуазеі і не стварачы спрыяючых умоў для барацьбы за дыктатуру пралетарыяту ў сваім уласным краі.

Ад гэтага часу адзіным аплотам марксызму зьяўляецца ленінізм і камунізм.

Сучасны сацыял-дэмакратызм ёсьць ідэйная апора капіталізму. Ленін тысячу разоў казаў праўду, калі гаварыў, што сучасныя сацыял-дэмакратычныя палітыкі зьяўляюцца «сапраўднымі агэнтамі буржуазеі ў рабочым руху і прыкашчыкамі клясы капіталістаў", што ў «грамадзянскай вайне пралетарыяту з буржуазеяй» яны нямінуча стануць на бок вэрсальцаў проці камунараў: **немагчыма зьнішчыць капіталізм ня зьнішчыўшы сацыял-дэмакратызм.** Таму эра адміраньня капіталізму зьяўляецца адначасна і эраю адміраньня сацыял-дэмакратызму ў рабочым руху.

Надышла эра панаваньня ленінізму і III Інтэрнацыяналу.

Спаленае белапалякамі м. Койданава (Меншчына).

Абарона рэвалюцыі.

Саветы перамаглі. Паўстаўшыя рабочыя і салдаты ў Кастрычніку скінулі з сваіх плячэй уладу здраднікаў —эсэраў і меншавікоў—і ўтварылі сваю рабочую ўладу—уладу Саветаў. Але: «засталіся буржуа-капіталісты, якія маюць надзею вярнуць свае панаваньне. Засталося басяцтва, слаі падкупных людзей, зусім раздаўленых капіталізмам і ня ўмеючых узвысіцца да ідэі пралетарскай барацьбы. Засталіся служачыя, чыноўнікі, якія думаюць, што ахова старога парадку—ёсьць інтарэсы грамады. Як можна прадставіць сабе перамогу сацыялізму інакшай, як поўным крахам гэтых слаёў, інакшай, як поўнай пагібельлю буржуазеі —і расейскай і эўрапейскай?» Так гаварыў Ільліч у сваім даклад е аб дзейнасьці СНК 11 студзеня 1918 году.

У Ваенна-Рэвалюцыйным Камітэце, утвораным для падрыхтоўкі і кіраўніцтва паўстаньнем, патрэба мінавала. Але небясьпек для рэвалюцыі яшчэ было шмат, і Савет Нар. Камісараў знайшоў неабходным утварыць спэцыяльны орган барацьбы з ворагамі Саветаў—«Всероссийскую Чрезвычайную Комиссию по борьбе с контр-революцией, саботажем и спекуляцией—ВЧК». Старшынёй ВЧК быў назначан т. Дзяржынскі.

Бяз вопыту, з вельмі малым лікам работнікаў, ВЧК павінна была распачаць безадкладную і няшчадную барацьбу.

Побач з бандытызмам і п'янымі пагромамі, на шляху разьвіцьця і ўзмацаваньня Савецкай улады, існавалі ў той момант далёка больш небясьпечныя ворагі. Гэта—сабатаж інтэлігэнцыі і ўпартая работа антысавецкіх партый вакол «учредительного собрания».

З першых-жа дзён арганізацыі Савецкай улады інтэлігенцыя ўвайшла ў стачку супроць Саветаў.

З разгонам «учред. собрания» зьніклі надзеі контр-рэвалюцыйных сіл на перамогу ў бліжэйшы час. Крушэньне гэтых надзей і рэпрэсыўныя меры, прынятыя з боку ВЧК, ліквідуюць канчаткова сабатаж інтэлігэнцыі. Яна пачынае вяртацца на працу.

Настала вясна 1918 г. Саветы мацнеюць. Савецкая краіна, хоць і «ганебным» Берасьцейскім мірам, вышла з вайны і шаг за шагам узмацняе сваю ўладу. Чырвоная гвардыя абараняецца ў Чырвоную армію, арганізуецца ў рэгулярныя вайсковыя часьці. ВЧК арганізуе свае аддзелы па ўсёй краіне, узмацняецца міліцыя, і ў краіне пасьпяхова ажыцьцяўляецца рэвалюцыйны парадак.

Вясною 1918 г. сілы контр-рэвалюцыі пачынаюць арганізоўвацца сур'ёзна і моцна, шукаць сувязі і дапамогі міжнароднае буржуазеі. Антанта, асабліва раззлаваная выхадам Расеі з сусьветнае вайны, ануляваньнем царскіх даўгоў, а, галоўным чынам, тым, што пралетарская рэвалюцыя ў Расеі зьяўляецца факелам, які запальвае сусьветную рэвалюцыю, шчодра ідзе на дапамогу ўнутранай контр-рэвалюцыі.

ВЧК выкрывае змову за змовай, і амаль у кожнай з іх актыўная роля належыць міжнароднай буржуазеі.

У пачатку мая ВЧК выявіла буйнейшую змову ў Маскве. Энэргічнай распрацоўкай матар'ялаў устаноўлен штаб кватэры гэтых змоўшчыкаў, і пры вобыску кватэры і арышце 18 чалавек, амаль выключна б. афіцэраў, устаноўлена, што гэта ёсьць савінкаўская арганізацыя—«союз спасения родины и свободы». Удаецца ўстанавіць, што гэта арганізацыя мае аддзяленьне ў Казані, мае сувязь з чэха-славацкімі легіёнамі, а таксама ўстаноўлена, што чэха-славацкія часьці рыхтуюцца да выступленьня супроць савецкай улады.

Выкрыцьцё змовы савінкаўскай арганізацыі паказала ВЧК, што справы ўнутры краіны сур'ёзны. Дэсанты ў Архангельску, на Далёкім Усходзе, паўстаньне чэхаў — усё гэта ставіла над сур'ёзьнейшыя ўдары існаваньне савецкай улады. Адпаведна з унутраным становішчам ВЧК стала падхадзіць да арыштаваных белагвардзейцаў з савінкаўскай арганізацыі, і тут пры ўстанаўленьні меры сацыяльнай абароны ў ВЧК узьніклі сур'ёзныя розгалосьсі.

З прычыны таго, што ўрад у пачатку рэвалюцыі ўтварыўся з дзьвёх партый—бальшавікоў і левых эсэраў, апошнія запатрабавалі свайго ўдзелу ў ВЧК. Нават больш; цэнтр. камітэт лев. эсэраў у свой час катэгарычна трабаваў, каб нам. старшыні ВЧК быў левы эсэр. Такім чынам левы эсэр Александровіч аказаўся нам. старшыні ВЧК.

Калі паўстала пытаньне аб расправе з паўстаўшымі белагвардзейцамі, левыя эсэры занялі надзвычайна мяккую лінію. Левыя эсэры былі супроць растрэлу белагвардзейскіх афіцэраў, якія знаходзіліся на савецкай службе і выконвалі ролю ня толькі шпіёнаў, а і паўстанцаў супроць рабочае клясы.

6-га ліпеня высьветліліся ўсе паводзіны левых эсэраў. У часе V зьезду Саветаў левыя эсэры паўсталі, забіўшы нямецкага пасла Мірбаха, падрыхтаваўшы загадзя глебу паўстаньня.

Высьветлена, што ня толькі Савінкаў, а і левыя эсэры аказаліся арудзьдзем у руках францускага прадстаўніка Нуланса. Яны пайшлі на хаўрус з Нулансам, абы толькі справакаваць вайну з Нямеччынай.

У жніўні ВЧК выкрыла другую контр-рэвалюцыйную арганізацыю, г.з. арганізацыю паслоў - загаворшчыкаў: Лёкарта — ангельскага, Пуля—амэрыканскага і Грэнара—францускага.

Загаворшчыкі-паслы займаліся падрыхтоўкай узрываў мастоў, падпалаў, разбураньня чыгуначных каляін і г. д. Пасьля арышту аднаго з агентаў гэтых паслоў (Калмацьяна) удалося расшыфраваць усю шпіёнскую сетку.

Увосень 1919 г., калі нашае становішча асабліва ўскладнілася на фронтах, калі вораг быў блізка ад Ленінграду і Тулы, ВЧК удалося выкрыць арганізацыю, якая трымала ў сваіх руках усю арганізаваную контр-рэвалюцыю ў Рэспубліцы —гэтак званы «тактический цэнтр».

Пры ліквідацыі «тактического центра» і ўсіх арганізацый, якія ўваходзілі ў яго склад, ВЧК выкрыла масу дакумантаў, характарызуючых дзейнасьць гэтых арганізацый і работу ўсёй расейскай контр-рэвалюцыі.

Можна было-б прывесьці яшчэ многія змовы, якія былі выкрыты ў свой час ВЧК, але ўся арганізаваная контр-рэвалюцыя ўвайшла ў «тактический центр» і «союз возрождения» (апошні арганізаваўся вясною 1918 г. у яго ўваходзілі левыя кадэты, эсэры, група «Единство», народныя сацыялісты і правыя меншавікі).

У бандыцкіх паўстаньнях эсэры прымалі жывейшы ўдзел. Самую гнусную ролю сацыял-здраднікі адыгрывалі ў руках міжнароднай і сваёй буржуазеі ў якасьці тэрарыстаў.

Сама буржуазея магла высунуць з свайго асяродку забойцаў для Вароўскага, Войкава і інш. савецкіх працаўнікоў заграніцай. У СССР для тэрарыстычнай работы яны шукаюць «спэцыялістаў» з радоў сацыял-здраднікаў.

Аб падрыхтаваным замаху на Уладзіміра Ільліча ў ВЧК наступалі зьвесткі даўно. ВЧК прыняла ўсе меры, каб захаваць жыцьцё правадыра пралетарыяту. Але ахоўваць Уладзімера Ільліча было вельмі цяжка.

Уладзімер Ільліч любіў бываць усюды. Даволі ўспомніць такі мала вядомы факт, што ўжо пасьля замаху на яго і выздараўленьне, у сьнежні 1918 г. ён каля Сакольнікаў быў высаджаны з аўтамабіля бандытамі. У яго забралі рэвальвэр і дакуманты. Бандыт Кашалёў абмыліўся ў прозьвішчы. Як ён пасьля паказаў у часе арышту на запытаньне, што ён зрабіў бы, каб пазнаў Леніна, ён, не задумваючыся, адказаў: «Зразумела, забіў бы». Уладзімір Ільліч любіў спатыкацца з масай, на фабрыках, бываць на кватэрах у асобных таварышоў—усё гэта абцяжвала ахову.

Летам 1918 г., 30 жніўня, Маскоўскі Камітэт назначыў мітынг на многіх заводах. Уладзімір Ільліч накіраваўся на фабрыку Міхельсона выступаць. Тав. Гіль апавядае:

— Калі Ленін быў ужо на адлегласьці трох шагоў ад аўтамабіля, я ўбачыў, што збоку, на адлегласьці ня больш трох крокаў, з-за некалькіх чалавек жаночая рука зрабіла тры выстралы з браўнінга, пасьля якіх я кінуўся ў той бок, адкуль стралялі. Жанчына, што страляла, кінула мне пад ногі рэвальвэр і схавалася ў натоўпе.

Сьведка—тав. Батулін, пам. вайск. камісара 5-й Маскоўскай Савецкай пях. дывіі, паказаў:

— Я чуў тры выстралы і ўбачыў тав. Леніна, які ляжаў ічком на зямлі. Я закрычаў: „Дзяржы, лаві!“ і ззаду сябе ўбачыў жанчыну, якая вяла сябе вельмі дзіўна. Калі я яе затрымаў і калі з акаляючага натоўпу пачуліся крыкі, што страляла гэта жанчына, я спытаўся яшчэ раз, ці яна страляла ў Леніна. Апошняя адказала, што яна. Нас абкружылі ўзброеныя чырвонаармейцы і міліцыянэры, якія не далі зрабіць самасуд над ёй.

— Я стаяла за „учредительное собрание“ і зараз стаю за гэта. У эсэраўскай партыі я бліжэй стаю да Чарнова,—паказала Каплан на дапросе ў ВЧК.

Настаў 1922 год. Саветы разграмілі сваіх ворагаў. Рабочая кляса ў цэлым аб'ядналася вакол камуністычнае партыі, стварыла мільённую армію, разграміла дэнікінскія, калчакоўскія ды інш. банды, скінула ў мора дэсанты міжнароднай буржуазеі. Імпэрыялістычныя краіны ўпэўніліся ў сваім бясьсільлі перамагчы саветы ўзброенай сілай. Пачынаецца прызнаньне СССР з боку буржуазных краін.

Унутры краіны пралетарыят, вызваліўшы свае сілы ад грамадзянскіх франтоў, пачаў будаваць сваё жыцьцё на новых пачатках.

Запатрабавалася зьмена ў рабоце ВЧК.

На IX зьезьдзе Саветаў Ільліч, даўшы найлепшую ацэнку ВЧК, яе цяжкай і адказнай рабоце, далей гаворыць, што нашы дадатнасьці могуць абярнуцца ў хібы, калі мы ў свой час не ацанілі абставін і ня зьменім сваіх мэтадаў барацьбы адпаведна ўтварыўшымся новым абставінам. ВЧК рэарганізуецца ў Аб'яднаную Дзяржаўную Палітычную Ўправу—АГПУ—пры Саўнаркоме.

Ці азначае гэта, што АГПУ мае меншае значэньне для краіны?

Ніколькі.

Мы ўзмацнелі, у нас больш часу, мы можам лепей разьбірацца ў справах, разглядаючы іх у гласным судзе. І рэвтрыбуналы, як гэткія, касуюцца, утвараюцца нармальныя суды. Краіна ўступае ў паласу больш менш нармальных абставін.

Але нашы ворагі, не дабітыя рэвалюцыяй, мясцовыя і замежныя, любяць нас ня больш, чым тады, калі мы ўзброенай рукой змагаліся не па жыцьцё, а на сьмерць.

Адчыніўшы дзьверы буржуазным прадстаўніцтвам, мы пусьцілі да сябе ў дом „гасьцей“, якія сочаць за кожным нашым крокам, за нашым ростам, за нашай арміяй, вывучаюць нашы хібы і запаўняюць краіну шпіёнамі.

Работа АГПУ ўскладняецца ў шмат разоў. Няма вялікіх адкрытых контр-рэвалюцыйных загавораў, але вядзецца шолёная работа з боку варожых нам краін, асабліва Англіі, каб нанесьці нам шкоду.

Апарат АГПУ, складзены т. Дзяржынскім, мае свае слаўныя традыцыі барацьбы. У змаганьні з ворагамі ён ня дрогне ні перад якімі цяжкасьцямі і будзе заўсёды гатоў адбіць усякую спробу буржуазіі ці яе лёкаяў нанесьці ўдар у сьпіну Савецкаму Саюзу.

Я. Пэтэрс.

Вялікі помнік культуры.

Рабочыя і сяляне Савецкай Беларусу ў дзень 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі закладваюць вялікі помнік культуры: 6-га лістапада ў гор. Менску адбудзецца ўрачыстая закладка Унівэрсытэцкага Гарадку. Да гэтага часу Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, які адсьвяткаваў ужо 6-ю гадавіну свайго існаваньня, ня меў спэцыяльна пабудованых памяшканьняў. Разьмяшчаўся ён у 14-ці будынках, раскіданых па горадзе, з якіх частка нават не зьяўляецца будынкамі былых сярэдніх школ. Такі стан разьмяшчэньня Унівэрсытэту не дазваляў яму правільна і нармальна весьці сваю працу. Толькі ў 10-ю гадавіну Кастрычнікавай рэвалюцыі, на восьмы год свайго існаваньня, Беларуская Рэспубліка зможа прыступіць да пабудовы спэцыяльных будынкаў Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту.

Разбураная вайной, акупацыяй, бандытызмам, Беларуская Рэспубліка ў першыя гады свайго існаваньня не магла зразу прыступіць да такіх капітальных пабудоў. Трэба было спачатку адрамантаваць разбуранае, паламанае, сапсаванае; трэба было ўсю сваю энэргію і ўсю сваю моц накіраваць па аднаўленьне гаспадаркі, на вывядзеньне культуры з таго заняпаду, у якім яна апынулася ў выніку царскай палітыкі, вайны, акупацыі і бандытызму. Толькі напружаная і ўпартая воля рабочых і сялян, накіроўваемая моцнай, як граніт, і цьвёрдай, як сталь, камуністычнай партыяй, далі магчымасьць Беларускай Рэспубліцы за невялікі тэрмін свайго існаваньня падняць гаспадарку і культуру да іх сучаснага стану. Да дзесятай гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі мы ў пашым гаспадарчым і асабліва ў культурным будаўніцтве перашагнулі цавеныя часы, мы маем магчымасьць ужо ўкладваць значныя сродкі ў капітальнае будаўніцтва. У мінулым годзе рабочыя і сяляне Беларусі ўрачыста закладвалі Асінаўскую электрычную станцыю, якая прывядзе ў рух машыны на фабрыках і заводах Аршанскай і Віцебскай акруг і асьвеціць самым сапраўдным электрычным сьветам нашыя цёмныя, раскінутыя па балотах і лясох вёскі; у гэтым годзе ва ўрачысты дзень Кастрычніка таксама ўрачыста мы закладваем пабудовы Беларускага Дзярж. Унівэрсытэту, які асьвеціць сапраўдным сьветам—сьветам сацыялістычнай культуры ўсю яшчэ досыць цёмную Беларусь. Рабочы і селянін сваімі мазолістымі рукамі заносяць на скрыжалі гісторыі блескучыя старонкі яе сьветлай будучыні. І на гэтых старонках разам з электрычнымі станцыямі, разам з новымі гмахамі фабрык і заводаў, разам з новай электрыфікаванай вёскай, дзе замест сахі поле будзе ўзорваць трактар,—на гэтых старонках будзе красавацца і Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, як векавечны помнік сацыялістычнай культуры.

6-га рабочыя і сяляне закладваюць будынкі Унівэрсытэту. Пабудова вялікая. На ўсё будаўніцтва патрэбна будзе затраціць 6.400.000 руб. Мяркуецца пабудаваць цэлы шэраг унівэрсытэцкіх гмахаў, якія ў стройным архітэктурна-арганізаваным парадку будуць складаць сабою цэлы Унівэрсытэцкі гарадок. Прадбачыцца пабудаваць: Галоўны Аўдыторны корпус, корпус для Беларускай Дзяржаўнай Бібліатэкі, Біолёгічны корпус, Анатамічны корпус, корпус Прыродазнаўчых Навук, корпус Хімічны, корпус для пазашкольнага жыцьця студэнцтва, агульнае памяшканьне для студэнтаў Унівэрсытэту і Рабфаку, два корпусы для кватэр пэдагагічнага пэрсаналу, два корпусы для абслугоўваючага пэрсаналу, патрэбныя надворныя пабудоўлі, баню, прачачную і гараж.

Усё гэта, зразумела, нельга будзе пабудаваць на працягу аднаго году: пляц пабудовы разьлічан на некалькі год з такім разрахункам, каб кожны год заканчвалася пабудова цэлага корпусу. У 1927-28 годзе пачнём пабудову Галоўнага Аўдыторнага Корпусу, які па арыентыровачным каштарысе абыдзецца 1.500.000 рублёў.

Закладка Унівэрсытэцкага Гарадку зьяўляецца найлепшай адзнакай дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі; гэта вынік напружнай працы рабочых і сялян за першае дзесяцігодзьдзе Кастрычнікавай рэвалюцыі на шляху сацыялістычнага будаўніцтва; гэта выкананьне іх арганізаванай пралетарскай волі. На VIII Усебеларускім Зьездзе Саветаў рабочыя і сяляне па дакладу Народнага Камісарыяту Асьветы даручылі Беларускаму ўраду «пачаць пабудову ў бягучым годзе будынкаў Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту», Беларускі ўрад іх загад выконвае цалкам; ён прыняў усе меры, каб уся падрыхтоўчая праца па будаўніцтву Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту была праароблена, каб пабудова пачалася ў тэрмін, вызначаны Зьездам Саветаў.



Будынак Белпэдтэхнікуму імя Ўс. Ігнатоўскага

Уся падрыхтоўчая праца па будаўніцтву Унівэрсытэцкага Гарадка, патрэбная, каб пачаць пабудову, амаль што закончана. У выніку ўсесаюзнага конкурсу, які абвяшчаў Народны Камісарыят Асьветы на пабудову Унівэрсытэцкага Гарадка, было атрымана некалькі прэміраваных праэктаў, адзін з якіх і лёг у аснову далейшага спраэктаваньня і разьмяшчэньня пабудоў Унівэрсытэцкага Гарадка. У сучасны момант ужо цалкам распрацаваны генэральны плян распалажэньня ўсіх будоў, эскізныя праэкты пабудоў, арыентыровачныя каштарысы, календарны плян будаўніцтва, палажэньне аб будаўніцтве і праэкт тэхнічных умоў будаўніцтва.

Месцам пабудовы Унівэрсытэцкага Гарадка абраны пляц у раёне Савецкай вуліцы і будзе ахапляць вучастак зямлі паміж Бабруйскай, Ленінградзкай і Стара-Базарнай вуліцамі. Месца гэта хоць і не зьяўляецца ідэальным, мае ўсё-ж такі цэлы шэраг пераваг перад іншымі праэктаванымі месцамі. На гэтым вучастку ўжо знаходзяцца 2 корпусы Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту, якія цалкам увойдуць у склад Унівэрсытэцкага Гарадку (сучасны галоўны будынак Унівэрсытэту і пабудованы яшчэ Менскім Сельска-Гаспадарчым Інстытутам—Батанічны корпус); месца гэтае мяжуе з галоўнай вуліцай гор. Менску—Савецкай. Генэральны плян пабудовы Унівэрсытэцкага Гарадку разьлічан так, каб з Савецкай вул. былі відны ўсе карпусы Унівэрсытэцкага Гарадка; гэтым самым пабудова Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту зможа аздобіць гор. Менск лепшымі і прыгажэйшымі будынкамі.

Пабудова Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту зьяўляецца вынікам нацыянальнай палітыкі ўсяго Савецкага Саюзу, сутнасьць якой у тым, «каб зьнішчыць тую адсталасьць (гаспадарчую, палітычную і культурную) нацыянальнасьцяў, якую яны атрымалі ў спадчыну ад мінулага, «каб даць адсталым народам магчымасьць дагнаць Цэнтральную Расею ў дзяржаўным, культурным і гаспадарчым адносінах» (тав. Сталін на X зьезьдзе РКП(б). На сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту СССР у 1927 годзе па дакладу Беларускага ўраду абгаварвалася пытаньне і аб будаўніцтве Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту і была вынесена пастанова: «Адзначаючы культурную і палітычную ролю Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту, як насіцеля нацыянальнае беларускае культуры, аказаць садзейнічаньне мерапрыемствам Ураду Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі ў галіне пашырэньня дзейнасьці Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту і пабудовы для гэтай мэты ў бліжэйшыя 3 гады спэцыяльных будынкаў з уключэньнем у фінансавы плян неабходных дзеля гэтага сродкаў».

Агульнымі сіламі ўсяго пралетарыяту ў саюзе з бядняцкім і серадняцкім сялянствам мы цьвёрда і ўпэўнена ідзём наперад па шляху сацыялістычнага будаўніцтва і ў дзесятую гадавіну Кастрычнікавай рэвалюцыі, ня гледзячы на паўзучыя цёмныя хмары з Захаду, наш крок яшчэ ўпэўненей, голас гучней.

А. Баліцкі.

Пятая песьня.

З ЦЫКЛЮ ВЕРШАЎ «ШЧАСЬЦЕ».

І сонца, як сонца,
І дзень, як дзень,
ідзеш каля брамы—
на браме цень.

Дзесятая восень
з пагардай прышла.
А вецер, як вецер,
імгла, як імгла.

Вось толькі ў грудзёх,
вось у сэрцы адным
шчасьце віецца
пярсьцёнкам, як дым.

Зара разьлівае
на вуліцах кроў,
волатам вольным
Кастрычнік прышоў.

Вялікае шчасьце,—
няведамы ўздым
з гораду ў горад
нясуць гарады.

Вялікае шчасьце
ня здань і ня цень,—
З сусьвету гасьцінна
прымаем гасьцей.

І песьні і шчасьце—
Зямля харства.
Вырас пасёлак,
дзе тухла дрыгва.

Чязнанае шчасьце,
ўрачыстасьць, агні
і новае сонца,
і новыя дні...

Андрэй Александровіч.

Кастрычнік вывеў беларускую песьню на вольны шлях

На мастацтва наогул можна глядзець, як на выяўленьне ў прыгожых вобразах „дамінанты“ тае ці іншае эпохі, выяўленьне грамадзкае сутнасьці жыцьця, выяўленьне тых імкненьняў, жаданьняў, густаў, поглядаў, настрояў, якія пануюць сярод тае ці іншае клясы грамадзянства. Адсюль мастацтва, пакуль існуюць грамадзкія клясы, можа быць толькі клясавым, адсюль таксама ясна, якое значэньне мела і далей будзе мець Кастрычнікавая рэвалюцыя для мастацтва. На паверхню жыцьця вышла новая, магутная кляса. Яе імкненьні, жаданьні, густы, погляды, настроі складаюць „дамінанту“ новае эпохі, і гэтая „дамінанта“ павінна ўвайсьці ў мастацтва, як яго зьмест, і надаць яму формы, адпаведныя новаму зьместу. Гэты ўваход новае „дамінанты“ ў мастацтва ўжо і адбываецца.

У чым замыкаецца гэты ўваход? Абмяжуем гэтае пытаньне музыкай на Беларусі: як рэальна адбываецца ўваход новае „дамінанты“ ў беларускую музыку, што новага прынесла ў беларускую музыку вялікая рэвалюцыя, якія зьмены ўжо адбыліся і якія яшчэ павінны адбыцца? Будзем адрозьніваць тут музычны фундамант ад музычнае надбудовы на ім. Фундамант—народная песьня, надбудова—мастацкая музыка.

Кастрычнік вывеў на вольныя прасторы беларускую песьню, якая загучала вольна і магутна і зьявілася шмат для каго нейкай музычнай Амэрыкай. Яна перастала хавацца недзе ў нетрах прыгнечаных народных мас, адкуль ад часу да часу здабывалі яе вучоныя-этнографы, як нейкі этнаграфічны „унікум“, але загрымела свабодна і гучна, як самастойная музычная каштоўнасьць. Гэты вывад беларускае песьні на волю ёсьць першы вынік рэвалюцыі. Яна не закранула пакуль што зьместу народнае песьні, бо песьня складаецца паволькна, утварэньне яе праходзіць праз цэлыя шэрагі пакаленьняў, а 10 год рэвалюцыі для такога працэсу—тэрмін занадта малы. Але ўжо і цяпер, хаця-б a priori, мы можам з упэўненасьцю сказаць, што зьмест народнае беларускае песьні і яе музыка павінны грунтоўна зьмяніцца. Тая беларуская песьня, якую мы ведаем, песьня надзвычайна музычна-прыгожая, але песьня сумная, у якой заўсёды чуецца „сьляза гаротная“ павінна памерці і зьмяніцца песьняй новага жыцьця, песьняй радасьці, бадзёрасьці, сілы і шчасьця.

Вывад беларускае песьні на волю ў сваю чаргу меў аграмадныя вынікі. Гэтая вольная цяпер песьня стала фундамантам для пабудаваньня на ёй мастацкае музыкі. Тут ужо мы бачым нешта зусім новае, чаго раней ня было, бо беларускае мастацкае музыкі да Кастрычнікавае рэвалюцыі не існавала. Чаму? На гэтае пытаньне лепш за ўсё адказаць новым пытаньнем: чаму кампазытары Манюшка і Карловіч пісалі на грунце беларускае песьні польскую музыку, а Глінка, мусіць, і ня ведаў беларускае песьні? Чаму наш сучасьнік, кампазытар Л. Рагоўскі, напісаўшы „Беларускую сюіту“, змоўк і не адгукаецца на ўсе нашыя заклічы да яго з Менску? Прычыны ўсіх гэтых сумных зьявішчаў ясныя і высьвятленьня, здаецца, не патрабуюць.

Толькі Кастрычнік прынёс нам тыя ўмовы, у якіх магла і нават павінна была зьявіцца беларуская мастацкая музыка. Толькі Кастрычнік даў нам тыя ўстановы, якія будуюць беларускую мастацкую музыку (музычны тэхнікум і два беларускія тэатры), толькі Кастрычнік выклікнуў да працы ў гэтай галіне нашых уласных музычных дзеячоў і прыцягнуў да гэтай-жа працы нямала буйных музычных сіл з іншых цэнтраў СССР. І вынікі атрымаліся сапраўды вялічэзныя.

На чале працэсу ўтварэньня беларускае мастацкае музыкі стаіць Беларускі Дзяржаўны Музычны Тэхнікум з яго выкладчыкамі (Аладаў, Прохараў, Шнітман, І. Фідлон і Мацісон) і слухачамі клясы тэорыі кампазіцыі. А побач з тэхнікумам працуюць два дзяржаўныя тэатры, якія ў сваіх пастаноўках патрабуюць музыку і якія прыцягваюць да працы і сваіх і буйных расейскіх кампазытараў (Грэчанінаў, Аляксандраў, Сакалоў і інш.). Музычны тэхнікум існуе толькі 3 гады, БДТ 1—сем год, а БДТ 2 - пачаў толькі другі год свайго існаваньня, а мы маем ужо досыць доўгі шэраг твораў беларускае мастацкае музыкі—інструмантальнае і вакальнае, камернае і сімфанічнае. Праца ідзе, аднак, ня толькі ў Менску, але і ў іншых гарадох Беларусі,—Магілеве (творы настаўнікаў Магілеўскае муз. школы Каранеўскай, Боркуса і Я. Пэўзнэра), Гомелі (С. Пэўзнэр), Бабруйску (Павіцкі). Мы маем ужо такія творы, якімі беларуская музыка можа справядліва ганарыцца (квінтэт C-dur Аладава, яго-ж рамансы). За некалькі год зроблена столькі, колькі ня было зроблена (бо і не магло быць зроблена) за цэлыя стагодзьдзі. Такі быў вынік вольнага разьвіцьця пачаткаў нацыянальнае культуры (нацыянальнае палітыкі савецкае ўлады), а гэтае вольнае разьвіцьцё даў нам толькі Вялікі Кастрычнік

У галіне музычнай ён даў нам яшчэ болей,—ён забясьпечыў нам далейшае разьвіцьцё беларускае мастацкае музыкі, бо прынёс яшчэ нешта, што раней таксама зусім не існавала. Гэта „нешта“ ёсьць музычная асьвета. Неяк жудасна робіцца, калі ўспомнім аб становішчы рэчаў да рэвалюцыі,—ніводнае хаця-б маленечкае музычнае школы на ўсім абшары сучаснае БССР, і—адна-адзіная музычная школа на ўсю „этнаграфічную“ Беларусь (у Вільні). Гэта была сапраўдная пустыня, пустыня ў беларускай музыцы, пустыня ў музычнай асьвеце.

Што-ж даў нам Кастрычнік? Цікава параўнаць стан рэчаў у Заходняй Беларусі, якая стогне пад „культурным“ ботам Пілсудзкага, са станам рэчаў у нас. Там, як і раней, ніводнага новага твору беларускае мастацкае музыкі, у нас доўгі шэраг іх. Там, як і раней, беларуская песьня „загнаная“, у нас яна вольная. Там, як і раней, музычна-асьветная пустыня, а ў нас, у часьціне Беларусі, у маленькай БССР мы маем: Беларускі Дз. Муз. Тэхнікум, які неяк стыхійна разгортваецца і сёньня—заўтра будзе Беларускай Кансэрваторыяй, музычныя школы ў Магілеве і Менску, малыя тэхнікумы ў Гомелі і Віцебску. А гэта-ж толькі пачатак працэсу разьвіцьця музычнае асьветы.

Вось чаму беларускі музыка павінен помніць і ясна ўяўляць сабе, што дала яму Кастрычнікавая рэвалюцыя і чаго ня мае яго брат на Захадзе, і рабіць адсюль належныя вынікі. І трэба сказаць, што беларускія музыкі ўсё гэта помняць, уяўляюць і вынікі робяць. Яны адчуваюць сябе членамі вялікае сям'і беларускага пралетарыяту, яны ўносяць і сваю працу ў супольнае будаваньне новага жыцьця, бо перад іхнімі разумовымі вачыма лунае сьветлы малюнак прыгожае будучыні, бо яшчэ больш за 75 год таму назад вялікі правадыр музыкаў Рыхард Вагнэр у сваёй брашуры-маніфэсьце „Мастацтва і рэвалюцыя“ вучыў сваіх таварышоў:

„Праўдзівае мастацтва можа ўзьняцца са свайго становішча цывілізаванага барбарства на годную яго вышыню толькі на плячох нашага вялікага сацыялістычнага руху. У яго з ім супольная мэта, і яны могуць яе дасягнуць толькі тады, калі абодвы прызнаюць яе. Гэтая мэта—чалавек прыгожы і сільны; няхай рэвалюцыя дасьць яму сілу, а мастацтва—хараство“.

Ю. ДРЭЙЗІН.

Кастрычнікавыя дні ў Магілеве-стаўцы.

I.

У дні Кастрычніка шумеў, гудзеў Магілеў-стаўка, цьвякаў ён вельмі і вельмі ваяўніча зброяй і, пагражаючы мяцежнаму Петраграду, грозна вымаўляў:

— Іду на вы!

Гэта брацаньне зброяй, гэтыя зборы да паходу, гэтыя спробы з'арганізаваць у Магілеве новы ўрад на чале з Чарновым, сьцягваньне ў стаўку ўдарнікаў, казакаў і іншых вайсковых часьцей, нарады да раніцы, на якіх гучэлі громы, бліскала маланка гневу па адрасу паўстаўшага Петраграду.

У перадкастрычнікавыя дні мы былі зусім адрэзаны ад сталіцы і жылі толькі чуткамі і дагадкамі.

Дарэмна ў тыя дні пішучы гэтыя радкі абіваў парогі памяшканьня стаўкі і прасіў міласьці дзяжурнага генэрала:

— Якія-ж, урэшце, у вас маюцца весткі?

Адказ быў адзін:

— Нічога дакладна ня ведаем. Поўная бязладзіца, у якой мы самі дрэнна разьбіраемся. І даваць вам інфармацыю пры гэткім становішчы ня можам.

Пачакаем яшчэ адзін дзень.

II.

І вось здарылася тое, што раптам змоўк тэлеграф, анямела Петраградзкае Тэлеграфнае Агенцтва і загаварылі ставусныя пагалоскі.

Чуткі адны другіх страшней, расьлі і мацнелі, даводзілі да панікі і сьледам за тым, зрабіўшы сваю справу, г. зн. кінуўшы іскру трывогі, рассыпаліся бясьсьледна і зьяўляліся новыя чуткі.

Мінуючы законную інстанцыю—тэлеграфнае агенцтва (ПТА), чуткі і весткі ўсё-ж падалі ў адрэзаны ад сталіцы Магілеў і даходзілі да нас часта з густым налётам самага беспардоннага мяшчанства:

— Петраград захоплен бальшавікамі.

— Казакі перайшлі на бок бальшавікоў....

— Апроч трох палкоў.

— Керанскі расстраляны...

— На Магілеў пасоўваюцца бальшавікі. Каля Воршы затрыман цягнік з бальшавіцкім войскам.

— Значыцца, будуць баі?

Не пазьней, як праз дзень. Але палохацца няма чаго: стаўка бальшавікоў у парашок сатрэ!..

А тэлеграф маўчаў, як нямы. Петраградзкае тэлеграфнае агенцтва не гаварыла, не хацела нічога гаварыць, спачатку ўпарта маўчала пра кастрычнікавыя падзеі.

Але ў паветры востра адчувалася наэлектрызаванасьць. Ясна было, што надышлі рашучыя падзеі, што адчыняецца з гэтага часу новая старонка ў жыцьці ў Расеі, што зьлічаны дні часовага ўраду,што разрадзілася грозавая энэргія. 26 кастрычніка (даты па старому стылю) вярнуўся з аб'езду губэрні губэрскі камісар, і ў той-жа дзень (увечары) склікана была надзвычайная шматлюдная нарада прадстаўнікоў усіх урадавых і грамадзкіх устаноў гор. Магілеву, усіх рэвалюцыйна-дэмакратычных арганізацый, чыноў стаўкі, агульнаармейскага камітэту пры стаўцы, польскай і беларускай радаў і інш., пры чым на абвестцы дню сталі пытаньні:

Як рэагаваць на перажываемыя палітычныя падзеі, якой тактыкі трымацца, якую лінію чыннасьці намеціць перад тварам нахлынуўшых падзей, кінуўшых на вагі лёс Расеі.

Што-ж рабіць? Як абараніць Магілёў-стаўку і г. д.

III.

Гэта нарада, якая цягнулася да раніцы і не дала ніякіх вынікаў, калі ня лічыць абраньне асобнай «камісіі па абароне рэвалюцыі і правапарадку» з удзелам прадстаўнікоў ад усіх устаноў, партый і арганізацый, гэта шматлюдная нарада, скліканая ў момант, калі там, у сталіцы, яшчэ нацэлены былі вінтоўкі, дымеў порах у парахаўніцах і, абкураны парахавым дымам, моцна трымаўся на сваіх пазіцыях прымкнуўшы да паўстаньня петраградзкі гарнізон,—поўна была вялікай цікавасьці, бо яна была пачаткам цэлага шэрагу падзей ужо ва ўсерасейскім маштабе.

Заглянем-жа ў вялікую і сьветлую залю губэрскай земскай управы, дзе ў той вечар выступалі лепшыя прамоўцы ўсіх палітычных партый, урадавых і грамадзкіх арганізацый, дзе яскрава выявілася ідэалёгія ўсіх тых, хто ствараў у тыя дні наш, так сказаць, „палітычны дзень“.

Вялікая заля губэрскай земскай управы перапоўнена. Тут прадстаўнікі гораду, земства, судовага ведамства, усе сацыялістычныя фракцыі, прадстаўнікі ўсіх нацыянальных, грамадзкіх і палітычных арганізацый, чыны стаўкі, агульнаармейскі камітэт, паштавікі, чыгуначнікі, губэрскі камітэт „польскай рады на Беларусі“, Беларускі камітэт, губ. савет сялянскіх дэпутатаў, інтэрнацыяналісты.

Каго тут толькі няма!..

А 8 гадзіне ўвечары выконваючы абавязкі камісара адчыняе надзвычайную нараду наступным паведамленьнем, якое прысутныя выслухалі з напружанай увагай.

— Падзеі,—гаворыць дакладчык,—набылі выразны характар: паведамленьні гавораць, што часовы ўрад арыштаваны і ўсе ўрадавыя ўстановы ў Петраградзе заняты бальшавікамі.

Стварылася надзвычайнае становішча, на якое ўсе павінны рэагаваць, бо мы тут маем справу са злачынным замыслам, які можа ў выніку загубіць усю рэвалюцыю ў цэлым. Калі падзеі гэтыя будуць мець свой лёгічны канец, дык і цэласьць Расеі, як дзяржавы, у вялікай небясьпецы. Цэлы шэраг цэнтральных сацыялістычных арганізацый выказаўся ня толькі адмоўна, але нават варожа да бальшавіцкай змовы, а што датычыцца арміі, дык у яе шэрагах—раскол. Частка за бальшавікоў, частка за часовы ўрад.

Керанскі пасоўваецца на Петраград з вялікім войскам да замірэньня бальшавікоў, на баку якіх—200 тысячны петраградзкі гарнізон.

IУ.

Лінія нашых паводзін, гаворыць прамоўца, павінна быць зараз-жа выяўлена, прычым першае слова павінны сказаць органы рэвалюцыйнай дэмакратыі, асабліва тыя, хто карыстаецца шырокім аўтарытэтам у шэрагах арміі—савет рабочых салдацкіх дэпутатаў і губ. савет. сялянскіх дэпутатаў. Іх адносіны да падзей бязумоўна адмоўныя, што яны ўжо выказалі, прычым Магілеўскі савет рабочых і сялянскіх дэпутатаў сёньня-ж пацьвердзіў гэтую рэзалюцыю, ужыўшы пры гэтым захады, каб парадак у горадзе ня быў парушаны ні справа, ні зьлева.

Усе грамадзкія арганізацыі павінны аб'яднацца з камітэтам рэвалюцыйнай абароны, каб папярэдзіць усякія выбухі, усякія эксцэсы.

Сёньня-ж разасланы ўсім арганізацыям, урадавым і грамадзкім устано-

На будаўніцтве „Чырвонай Бярэзіны“ (Н.-Барысаў).

вам Магілеўскай губэрні і інш. тэлеграмы: дружна аб'яднаемся навакол часовага ўраду. На маю прапанову першым адгукнуўся Рагачоў, дзе згодна атрыманай ужо сёньня тэлеграмы, сход усіх арганізацый, партый, прадстаўнікоў устаноў і інш. асудзіў замысел бальшавікоў у выразах, якія досыць ясна вычэрпваюць сутнасьць пытаньня.

Старшыня народна-сацыялістычнай партыі:

«Тут знаходзяцца прадстаўнікі ўсіх партый, арганізацый,—няхай-жа яны выкажуцца выразна.

Гэта будзе больш плянамерна.

Я прапаную апытаць усіх. У прыватнасьці, партыя народных сацыялістаў пастанавіла ўсімі сіламі падтрымліваць часовы ўрад, а падтрыманьне гэта можа выявіцца ў невыкананьні загадаў бальшавіцкага ўраду» і г. д.

Прапанова прымаецца, і першым выступае старшыня прафэсыянальных саюзаў г. Магілева:

«Прафэсыянальныя арганізацыі пастанавілі далучыцца да рэзалюцыі савету рабочых і салдацкіх дэпутатаў і, асуджаны замысел бальшавікоў, патрабуем разам з тым аддаць усю зямлю працоўнаму народу і ўжыць усе захады да хутчэйшага заключэньня міру».

Магілеўскі губ. камітэт бунда:

«Прызнаем выступленьні бальшавікоў пагібельнымі для рэвалюцыі і стаім на пункце гледжаньня часовага ўраду».

Вялікі дысананс уносіць у гэтыя галасы ўсіх партый заява групы інтэрнацыяналістаў:

«Не жадаючы працаваць у гэтай нарадзе разам з прадстаўнікамі кадэцкай партыі, якая ня змыла яшчэ з сябе плямы карнілаўшчыны, мы, інтэрнацыяналісты, устрымліваемся ад усякіх выступленьняў».

— Выходзьце !— чуюцца абураныя галасы, і ў залі зрабілася нязвычайнае замяшаньне, з якім ніяк ня мог справіцца званок старшыні, заклікаючага захаваць спакой і ня спыняць «чытаньне дэкларацый усіх партый».

Адзнач, гісторык—
гэта было ў ноч з 26 на 27 кастрычніка 1917 году.

СТАРЫ ЖУРНАЛІСТ.

Урачыстае пасяджэньне Ураду БССР.

5-га лістапада ў Доме Культуры адбылося ўрачыстае пасяджэньне Прэзыдыум ЦВК і СНК БССР разам з Менскім гарсаветам, пры ўдзеле ЦК КПБ, ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ, прафэсыянальных, вайсковых і грамадзкіх арганізацый, прысьвечаны 10-й гадавіне Кастрыльнікавай рэвалюцыі.

На пасяджэньні таксама прысутнічалі дзесяць удзельнікаў Кастрычнікавага перавароту на Беларусі ў 1917 г. і члены нямецкай кампартыі т. т. Фойфэр, Маркоўскі і Залін.

На пасяджэньні Прэзыдыум ЦВК і СНК прынялі адозву да працоўных БССР.

Удзельнік Кастрычнікавага перавароту т. Шчукін, камандуючы Беларускім вайсковым вокругам т. Ягораў, чыгуначнік Кулак і інш. віталі працоўных БССР з 10-й гадавінай Кастрычніка.

Загад па Чырвонай арміі і флёту.

МАСКВА. 4-11. У загадзе Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету за подпісам тав. Варашылава аб 10 годзьзі Кастрычнікавае рэвалюцыі гаворыцца:

«Вялікі Кастрычнік прарваў фронт сусьветнага імпэрыялізму. Зьнішчыўшы сваіх ворагаў ва ўзброенай барацьбе, рабочыя і сяляне распачалі працу мірнага сацыялістычнага будаўніцтва. Барацьба на фронце працы таксама мела вялікія перамогі. Забясьпечыўшы непарушанасьць савецкае ўлады ў час грамадзянскай вайны, чырвоныя ўзброеныя сілы зьяўляюцца ў час спакою гарантыяй посьпеху сацыялістычнага будаўніцтва.

10-ую гадавіну Кастрычніка край саветаў сьвяткуе ў абставінах надыходзячае пагрозы вайны. Імпэрыялістычная буржуазея гатуе нам новыя напады і новую вайну. Растуць буржуазныя арміі, флёты, павялічваюцца тэхнічныя сродкі зьнішчэньня.

Мы стаімо на варце спакою. Чырвоныя ўзброеныя сілы, ідучы разам з усёй краінай, упарта працуюць над палепшаньнем сваёй тэхнічнае і баявое магутнасьці.

Таварышы, чырвонаармейцы і чырвонафлотцы, камандзіры, камісары і палітычныя працаўнікі! Рэвалюцыйны Вайсковы Савет вітае вас з 10-годзьдзем Кастрычнікавае рэвалюцыі!

Вышэй баявыя сьцягі! Пад сьцягам Леніна ўмацоўвайце свае шэрагі!

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

Гонар кіраўніку Чырвонае арміі—Усесаюзнай Камуністычнай партыі!

Гонар героям грамадзянскае вайны!

Вечная памяць загінуўшым барацьбітом.

Няхай жыве СССР, першая ў сьвеце пралетарская дзяржава!

ПРЫЕЗД АНГЕЛЬСКАЕ ДЭЛЕГАЦЫІ.

ЛЕНІНГРАД. Сёньня на параходзе «Савет» у Ленінград прыбыла ангельская рабочая дэлегацыя ў складзе 110 чалавек. Дэлегацыю з захапленьнем спаткала некалькі тысяч рабочых, працаўнікі і прадстаўнікі розных арганізацый.

Старшыня дэлегацыі т. Лоўцер агаласіў дэклярацыю, у якой дэлегаты клянуцца, што яны будуць змагацца за стварэньне адзінства ангельскага і савецкага рабочага руху, а таксама абараняць заваёвы расейскае рэвалюцыі.

Гарачую прамову сказаў прыбыўшы разам з дэлегацыяй т. Саклатвала, якому была наладжана бурная авацыя.

10-ты Кастрычнік заграніцаю.

Маніфэст ЦК КП Англіі.

ЛЁНДАН, 4-11. ЦК ангельскае кампартыі агаласіў маніфэст у зьвязку з 10-цігодзьдзем Кастрычнікавае рэвалюцыі, у якім гаворыцца: клясава-сьвядомыя ангельскія рабочыя шлюць рабочай клясе СССР пажаданьне яшчэ большых посьпехаў у будаўніцтве сацыялізму. Яны абяцаюць падтрымаць СССР да апошняе кроплі крыві ў выпадку нападу імпэрыялістаў.

«Гэтая дэманстрацыя,—гаворыцца ў адозьве,—будзе доказам няўхільнае волі францускага ўраду ў барацьбе проці падрыхтоўкі да вайны і проці разрыву з СССР. Гэтая дэманстрацыя павінна выкрыць сацыялістычных лідэраў, пры падтрыманьні якіх праводзяцца нападкі на СССР, і даказаць рашучасьць францускага пралетарыяту прымусіць урад абвясьціць усеагульную амністыю».

Заклік францускае кампартыі да дэманстрацый.

ПАРЫЖ, 4-11. У „Юманітэ“ агалошана адозва парыскае арганізацыі кампартыі, якая прапануе працоўным браць удзел у дэманстрацыі ў зьвязку з 10-й гадавінаю Кастрычнікавае рэвалюцыі, назначанай на 6 лістапада ў ваколіцах Парыжу.

КАСТРЫЧНІКАВАЯ МАНІФЭСТАЦЫЯ ЗАБАРОНЕНА.

ПРАГА, 4-XI. Паліцыя забараніла камуністычную дэманстрацыю з прычыны 10-ці годзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі, назначаную на 6 лістапада.

Крэдыты СССР у Штырыі.

ВЕНА, 4-XI. Учора ў фінансавую камісію штырыйскага ляндтагу быў нададзен законапраэкт аб удзеле Штырыі ў гарантаваньні крэдытаў, прызначаных для разьвіцьця аўстрыйскага вывазу ў СССР. Згодна законапраэкту, Штырыя бярэ на сябе гарантаваньне крэдытаў у разьмеры 30 проц. ад кошту заказаў. Законапраэкт дае ўраду Штырыі права выпусьціць для гэтае мэты пазыку ў 2 мілёны шылінгаў.

Развал апазіцыі.

ЛЕНІНГРАД. У ленінградзкія газэты ня спыняюць паступаць заявы ранейшых апазіцыянэраў, якія здымаюць свой подпіс з заявы «83» і іншых апазіцыйных дакумантаў і рашуча адмаўляюцца ад апазіцыі. 4 лістапада паступілі заявы ад ранейшых апазіцыянэраў-рабочых: Жураўлёва, Вешнякова, Кулікава, Яхантава, Афінагенава, Люліна, Вірзіна, Юроўскага, Коласава і Філіпа.

ЦЯГА ПРАЛЕТАРЫЯЎ У ЛЕНІНСКУЮ ПАРТЫЮ.

БАКУ, 4-XI. У зьвязку з пасядаючай у сучасны момант у Баку партыйнай канфэрэнцыяй, з раёнаў паступаюць весткі аб вялікай колькасьці заяў ад беспартыйных рабочых аб жаданьні ўступіць у камуністычную партыю. Такіх заяў пададзена ўжо—1.061.

Польскі сойм распушчан.

Падрабязнасьці роспуску.

Як вядома з тэлеграм, апошняя сэсія сучаснага польскага сойму, скліканая дэкрэтам прэзыдэнта, была новым дэкрэтам прэзыдэнта раптам распушчана. Газэты падаюць цяпер падрабязнасьці гэтага цікавага моманту, якога ніхто не спадзяваўся. Віцэ-прэм'ер Бартэль у пачатку пасяджэньня папрасіў голасу і потым з трыбуны стаў ціханька чытаць дэкрэт прэзыдэнта. Як толькі пачуліся першыя словы аб роспуску, з пасольскіх лаваў пачуліся галасы абурэньня, крыкі, біцьцё ў пюпітры і паасобныя выкрыкі: «Сорам, ганьба, скандал» і шмат іншых, вельмі няцэнзурных. Стары пэпээсавец, пасол Дыяманд, крычаў у адрас Бартэля: «Пашлі, пане, за паліцыяй!»—«Камэдыя з дзяржавай!» крычыць другі пэпээс.

Пад агульны гул абурэньня маршалак сойму зачыніў апошняе пасяджэньне сойму, якое цягнулася толькі 8 мін.

Уздагонкі за мандатамі.

У часе бліжэйшых выбараў у сойм высунуць свае кандыдатуры ў паслы: марш. Пілсудзкі—у Варшаўскай акрузе, віцэ-прэм'ер Бартэль—у Львоўскай, Марачэўскі—у Стрыйскай і г. д.

Забастоўка ў Аўгустове.

Ад 1 лістапада ў аўгустоўскіх пякарнях пачалася агульная забастоўка.

СУД НАД Р. АСТРОЎСКІМ.

2 лістапада г. г. у Вільні павінен быў адбыцца суд над б. дыр. гімназіі Р. Астроўскім за адпор, які ён аказаў міліцыі пры выкіданьні ёю беларускай пачатковай школы з памяшканьня бел. гімназіі яшчэ 22 кастр. 1925 г.

Вядомы сьведка абвінавачаньня Вацлаў Студніцкі, вядомы пагромшчык беларускай справы ў Зах. Беларусі, на суд не зьявіўся. Суд адлажылі.

Напад на судзьдзю.

Гэтымі днямі цяжка паранен выстралам у галаву судзьдзя м. Ляхавіч, Баранавіцкага пав., М. Занарэўскі.

Справа Вільні.

Італьянская газ. «Обсэрвэр» у артыкуле «Ліга і Вільня», між іншым, піша: «Ліга Нацый у значнай меры нясе адказнасьць за віленскую блытаніну. У часе сэсіі ў сьнежні Ліга павінна ўрэшце заняцца Вільняй. Пара ўжо Лізе стаць Лігай супакою, а ня толькі Лігай Нацый».

Сьледзтва ў справе «Грамады».

„Кур'ер Віленьскі“ прастуе весткі, быццам сьледзтва па справе „Грамады“ ўжо скончана. Сьледзтва яшчэ цягнецца.

Разгон беластоцкай рады.

З прычыну выхаду некалькіх членаў беластацкай рады, апошняя па загаду ваяводы распушчана

Бірк апраўданы.

РЭВЕЛЬ, 4-11. Суд вынес прыгавар па справе Бірка. Прыгавар гаворыць: водлуг артыкулу III-га палажэньня аб пакараньнях, Бірка апраўдаць; водлуг артыкулаў 149 і 393—звольніць з пасады.

Суд пастанавіў вызваліць Бірка з пад варты.

Увага: у Эстоніі двайнічае царскае крымінальнае заканадаўніцтва. Артыкул III-ці карае за выкрываньне дзяржаўных тайн да аднаго году.

Арышты камуністаў у Латвіі.

Апошнімі днямі латвійская паліцыя арыштавала на абшары Латвіі шмат камуністаў.

Стачка чэхаславацкіх чыгуначнікаў.

ПРАГА, 4-XI. Перамовы між урадам і камітэтам чыгуначнікаў Чэхаславакіі ня далі ніякіх станоўчых вынікаў. Сёньня пачалася пасыўная забастоўка чыгуначнікаў на вузлавых пунктах. Чыгуначнікі дакладна выконваюць усе інструкцыі прафсаюзаў, у зьвязку з чым рух паступова прыпыняецца. У нядзелю таварныя паязды, як мяркуюць, спозьняцца ўжо на суткі.

Матч Алёхін-Капабланка.

БУЭНОС-АЙРЭС, 4-11. Не адназначныя гульні, Алёхін і Капабланка згадзіліся прызнаць 24 партыю нічыёю.

Гал улітбел № 2468.

Менск у Кастрычнікавыя дні.

Памілаваньне.

На апошнім пасяджэньні камісіі прыватных амністый пры Прэзыдыуме ЦВК БССР было разгледжана 586 спраў, з якіх 444 справы за незаконную парубку лесу і за іншыя праступленьні 142 справы.

Камісія поўнасьцю памілавала па 306 справах і часткова—па 101 справе.

Прыезд у Менск удзельнікаў Кастрычнікавага перавароту.

5-га лістапада прыехалі ў Менск удзельнікі Кастрычнікавага перавароту на Беларусі ў 1917 г. т. т. Фамін, Калмановіч, Крывашэін, Шчукін, Бэрно, Каменшчыкаў, Дзьмітрыеў, Глузман, Федзянёў і Разоўскі.

Удзень госьці знаёміліся з узростам нашае прамысловасьці за апошнія 10 год.

Закладкі новых устаноў.

ЗАКЛАДКА ЎНІВЭРСЫТЭЦКАГА ГАРАДКА.

6-га лістапада а 1-й гадзіне дню адбылася ўрачыстая закладка Гарадка Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту.

Гарадок закладзен на спэцыяльна адведзеным месцы па Савецкай вул.

ЗАКЛАДКА ЦЭНТРАЛЬНАЙ МАЛОЧНАЙ.

6-га лістапада а 2-й гадзіне дню на рагу вуліц Маскоўскай і Рыгораўскай адбылася закладка цэнтральнай малочнай, якая будзе пабудована да вясны 1929 г.

Будынак дзе зьмяшчаецца Менскі АВК і Гарсавет.

Клюбы—у дні Кастрычніка.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

5 лістапада адбыўся вялікі вечар, на якім прысутнічала да 800 асьветаўпаў. Пасьля дакладу аб 10-хгодзьдзі былі наладжаны ўспаміны ўдзельнікаў барацьбы за Кастрычнік. У канцэртнай частцы выступалі музтэхнікумаўцы, артысты ленінградзкіх тэатраў і хор палітасьветы.

6 лістапада для дзяцей сяброў саюзу наладжан раніштнік, на якім паміж іншым дэманстравалася фільма „Як Пятунька езьдзіў да Ільліча“.

8 лістапада ў Доме Асьветы адбудзецца вялікі вечар мясцкому БДУ, у якім прымуць удзел як свае, так і запрошаныя сілы. 9 лістапада адбудзецца вечар моладзі.

КЛЮБ САЎГАНДЛЬСЛУЖАЧЫХ.

5 лістапада адбыўся вечар для працаўнікоў калектыву ЦСУ. Пасьля дакладу аб дасягненьнях за 10 год быў наладжаны канцэрт сіламі гуртkoў клюбу і белмузтэхнікумаўцаў.

6 лістапада адбыўся вечар для працаўнікоў ЦРК. Драмгурток клюбу паставіў п'есу «Конец господ Ржевских». Апрача гэтага адбыўся канцэрт. Сёньня—такі-ж самы вечар для гарадзкіх групкомаў.

6 лістапада для дзяцей сяброў саюзу быў наладжан раніштнік.

КЛЮБ КАРЛА МАРКСА.

У сувязі з тым, што шмат якія арганізацыі ня маюць сваіх клюбаў, дзе можна было-б наладзіць у дні сьвята масавыя вечары для сяброў саюзаў, клюб Карла Маркса адмовіўся ад свайго вечара і перанёс яго на дні пасьля сьвята.

5 лістапада адбыўся вечар заводу „Энэргія“, 6—вечар саюзу скуранікоў, сёньня—вечар саюзу мэтлістых.

Новыя клюбы.

6 лістапада ўвечары адбылося ўрачыстае адчыненьне новых клюбаў. Апошнія адчыняюцца на заводзе „Пралетары“ і ў саюзе камунальнікаў.

Выстаўка Белдзяржгандлю.

Манаполія замежнага гандлю зьяўляецца ўлюбёнай тэмай атакі ўсіх ворагаў нашага Саюзу. Чым больш нашы ворагі цікавяцца гэтым фронтам, тым больш мы павінны яго абараняць, тым лепш павінна быць з ім знаёма наша рабоча-сялянская грамадзкасьць. Гэта першая прычына, якая штурхнула Белдзяржгандаль да арганізацыі экспортна-імпортнае выстаўкі. Другая прычына—гэта імкненьне азнаёміць падрабязна сялянскі актыў, які прыедзе з вёскі на Кастрычнікавыя сьвяты ў горад, з рэчамі нашага экспорту заграніцу, асабліва з сельска-гаспадарчым экспортам, які зьяўляецца галоўным відам беларускага вывазу, і які павінен пашырацца, чаго-б гэта не каштавала. Селяніну таксама неабходна ўказаць шлях непасрэдна да дзяржаўнага загатоўцы, даказаць яму, што пара выцiснуць з таваразвароту прыватніка, да якога, нажаль, так прызвычаіўся селянін. Важна таксама імпортная частка выстаўкі, на якой адаб'едца ўвоз у БССР за выручаныя за экспорт грошы. Нарэшце, да дзесяцігодзьдзя Кастрычніка пажадана было-б наглядна прадэманстраваць вынікі тае вялікае і цяжкае працы, якую прарабіў Белдзяржгандаль за 5 год свайго існаваньня.

Мы перакананы, што пры ўважлівых адносінах наведваючых да выстаўкі надзеі, ускладзеныя на яе, будуць ажыцьцёўлены. Мы запрашаем усіх гаспадарцаў, рабочых, служачых і сялян наведаць нашую выстаўку, якая адчыняецца ў нядзелю, 6-га кастрычніка, у 10 гадз. дню.

АДЧЫНЕНЬНЕ ВЫСТАЎКІ НАЦМЕНШАСЬЦЯЎ.

6 лістапада а 6 гадзіне ўвечары адчынілася рэспубліканская выстаўка — «Жыцьцё нацменшасьцяў».

На выстаўцы прадстаўлены экспанаты, якія малююць культурны і эканамічны рост нацменшасьцяў БССР.

На выстаўцы выступіў з прамовай старшыня нацкамісіі пры Прэзыдыуме ЦВК БССР т. Хацкевіч.

ЯК СЬВЯТКУЮЦЬ ШКОЛЬНІКІ.

Нашы школы яшчэ задоўга да сьвята разгарнулі падрыхтоўчую працу, якая ўвайшла ў комплекс „Кастрычнік“. Выданы юбілейныя насьценныя газэты, адбіваючыя дасягненьні за 10 год савецкага будаўніцтва, а таксама дасягненьні школ.

Дзеці выявілі максымум творчасьці ў прыбіраньні да сьвята сваіх школьных памяшканьняў, у наладжваньні вечароў самадзейнасьці і г. д.

Па ўсіх школах адбываюцца і будуць адбывацца ўрачыстыя вечары і раніштнікі, на якія запрашаюцца бацькі і прадстаўнікі розных арганізацый. Даклады аб сьвяце, успаміны ўдзельнікаў Кастрычніка, спэктаклі і г. д.,—вось чым адзначаюць школьнікі юбілей Кастрычніка. У вечарох і раніштніках вучні паказваюць дасягненьні ў галіне школьнае клюбнае працы.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ДЗІЦЯЧАЯ КАЛЁНІЯ.

9 лістапада ў Магілеве адчыняецца цэнтральная дзіцячая калёнія на 150 дзяцей.

ДЗІЦЯЧАЯ СТАЛОЎКА.

8 лістапада ў Менску адчыняецца дзіцячая сталоўка на 150 беспрытульных дзяцей

Сталоўку адчыняе камісія дапамогі беспрытульным дзецям пры прэзыдыуме ЦВК.

ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЕ ЯЎРЭЯЎ.

Нацкамісія пры Прэзыдыуме ЦВК 2 лістапада разгледзіла праэкт пастановы ўраду БССР аб гаспачарчым упарадкаваньні мястэчак. Праэкт прадугледжвае землеўпарадкаваньне беднейшых груп местачковага яўрэйства, забясьпечаньне мястэчак апалам і г. д.

4 лістапада праэкт быў унесен на разгляд СНК, які згадзіўся з асноўнымі прынцыпамі яго.

Для ажыцьцяўленьня гэтага праэкту СНК даручыў Дзяржплянy выпрацаваць канкрэтныя мерапрыёмствы і ўнесьці іх на разгляд у СНК.

Адчыненьне пасёлку пры заводзе „Дрэваапрацоўнік“.

6 лістапада а 2 гадзіне дню адбылося ўрачыстае адчыненьне пасёлку пры заводзе „Дрэваапрацоўнік“. Пасёлак ужо мае 3 гатовыя будынкі на 12 кватэр. Заканчваецца будынак на 5 кватэр.

Дапамога інвалідам.

Павялічэньне фонду пэнсыянэраў.

На сёлетні год фонд пэнсыянэраў мяркуюць павялічыць да 900 тысяч руб. (у мінулы год—450 тысяч руб.).

Дзякуючы гэтаму, будзе павялічан кантынгент пэнсыянэраў.

Падарункі інвалідам.

Да сьвята Кастрычніка Нар. Кам. Сацыяльнай Забясьпекі разьмеркаваў па акругах каля 11 тысяч руб. на набыцьцё падарункаў для інвалідаў, якія выказалі гэройства ў часе грамадзянскай вайны і партызанскай барацьбы.

У склад гэтых падарункаў уваходзяць коні, с.-гасп. машыны і інш.

Апавяшчэньне.

— 7 лістапада а 9 гадзіне ўвечары ў Доме Асьветы адбудзецца сямейны вечар групкому № 1.

Праграма вечара:

1) Даклад старшыні ЦП т. Платуна на тэму «Нашы дасягненьні за 10 год».

2) Выступленьні прадстаўнікоў розных літаратурных арганізацый.

3) Кіно-тэатр.

Уваход па сяброўскіх кніжках.

Прадстаўнікі шэфаў №-й імя нямецкага пралетарыяту дывізіі т. т. Пфайфэр і Макоўскі ў Менску.

Учора хуткім цягніком прыехалі ў Менск з Масквы член ЦК кампартыі Нямеччыны і сэкратар Бэрлінска-Бранддэбурскай арганізацыі КПН тав. Пфайфэр і прадстаўнік саюзу чырвоных франтавікоў Рурскай вобласьці т. Макоўскі.

Два дні таму назад т. т. Пфайфэр і Макоўскі прыехалі з Нямеччыны ў Маскву. У Маскве нямецкія госьці пабывалі ў Камінтэрне, а таксама знаёміліся з прадпрыёмствамі і культурнымі ўстановамі сталіцы СССР.

З Масквы таварышы Пфайфэр і Макоўскі прыбылі ў Менск дзеля перадачы прывітаньня падшэфнай №-ай імя нямецкага пралетарыяту дывізіі, а разам з тым правесьці супольна з чырвонаармейцамі і камсаставам апошняй Вялікае Сьвята пралетарыяту—10-хгадовы юбілей Кастрычнікавай рэвалюцыі.

У Менску гасьцей на вакзале спаткалі—прадстаўнік ЦК КП(б)Б і прадстаўнікі №-й падшэфнай дывізіі т. т. Калечыц і Мерзан, якія віталі шэфаў ад імя камсаставу дывізіі.

Учора т. т. Прайфэр і Макоўскі з прадстаўнікамі дывізіі паштовым цягніком выехалі ў месца распалажэньня дывізіі.

Сымпатыі працоўных Нямеччыны да СССР усё ўзрастаюць.

(ГУТАРКА З ТАВ. ПФАЙФЭРАМ).

Тав. Пфайфэр, у гутарцы з нашым карэспандэнтам, адзначыў, што маніфэст ураду СССР аб 7-мігадзінным рабочым дні распаўсюджан сярод рабочых Нямеччыны ў вялікай колькасьці як лістоўкамі, так і ў камуністычнай прэсе.

Пралетарыят Нямеччыны ў маніфэсьце аб 7-мігадзінным рабочым дні бачыць, што гаспадарчае жыцьцё ў Савецкім Саюзе ўзмацняецца не па днёх, а па гадзінах.

Пралетарыят Савецкага Саюзу мае вялікія дасягненьні ў галіне палепшаньня свайго становішча, а нашым братом Нямеччыны яшчэ прыходзіцца весьці барацьбу за 8-мігадзінны рабочы дзень, бо яны звычайна працуюць ад 9 да 10, а ў некаторых галінах прамысловасьці—па 12-14 гадзін у дзень. Рабочым Нямеччыны прыходзіцца весьці барацьбу за зарплату, якая значна ніжэй даваеннай, а фабрыканты імкнуцца яе яшчэ больш зьнізіць.

У заключэньне тав. Пфайфэр зазначыў, што, не зважаючы на ўсю ману буржуазнай і сац.-дэмакратычнай прэсы, рабочыя Нямеччыны ўпэўнены ў росьце гаспадарчага жыцьця Савецкага Саюзу. Сымпатыі рабочых Нямеччыны ў адносінах да першай і адзінай у сьвеце дзяржавы рабочых і сялян—СССР увесь час узрастаюць.

В. З-аў.

ПРЫВІТАНЬНЕ АД ПРАДСТАЎНІКОЎ НЯМЕЦКАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ ПРАЦОЎНЫМ БЕЛАРУСІ.

МЕНСК, 6-XI-27 Г.

РЭВАЛЮЦЫЙНАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ НАШЫМ БРАТОМ І СЁСТРАМ У БЕЛАРУСІ.

Па дарозе ў „нямецкую дывізію“ па ўпаўнаважаньні нашых арганізацыяў, мы дасылаем вам гарачае братэрскае прывітаньне.

Шырокія пралетарскія масы Нямеччыны заўтра па ўсіх гарадох Нямеччыны будуць дэманстраваць з повады 10-цігадовага юбілею Расейскай рэвалюцыі і будуць зьбіраць новыя сілы для барацьбы за зьвяржэньне буржуазнага ладу.

Факт 10-цігадовага юбілею Расейскай рэвалюцыі і будуць зьбіраць новыя сілы для барацьбы за зьвяржэньне буржуазнага ладу.

Факт 10-хгадовага існаваньня дыктатуры пралетарыяту ў Савецкай Расеі дае нам сілы ісьці па шляху, вызначаным Леніным, да канчатковай перамогі пралетарыяту ва ўсіх краінах сьвету.

Няхай жыве пераможны пралетарыят Савецкага Саюзу!

Няхай жыве Камуністычны Інтэрнацыянал!

ГАНЦ ПФАЙФЭР, сэкратар Бэрлінска-Брандэнбургскай арганізацыі камуністычнай партыі Нямеччыны,

ЮГАН МАКОЎСКІ, прадстаўнік саюзу чырвоных франтавікоў Рурскай вобласьці.

На пленуме ЦКК КПБ.

ВЫНІКІ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ ПРАМЫСЛОВАГА, ГАНДЛЁВА-КААПЭРАЦЫЙНАГА АПАРАТУ І ЗЬНІЖЭНЬНЯ АДМІНІСТРАЦ.-ГАСПАДАРЧЫХ ВЫДАТКАЎ.

(З дакладу тав. Элькінда).

Дырэктывы, дадзеныя на апошнім пленуме ЦКК аб утаненьні і спрашчэньні апарату, наогул выкананы. Бязумоўна, што на гэтым праца ня скончана таму, што рацыяналізацыя апарату павінна праходзіць паступова, супольна з разьвіцьцём прамысловасьці і падняцьцем тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі, прыцягваючы да гэтай працы шырокія колы працоўных з удзелам партмас. Адміністрацыя нашых трэстаў і наогул прадпрыёмстваў не выяўляе належнай ініцыятывы ў рацыяналізацыі апарату, а рабілася большай часткай пад націскам НК РСІ і ВСНГ.

Апарат трэстаў скарачаўся мэханічна і спрошчан толькі на 15 проц., структура таксама некалькі скарочана.

Цяпер перад намі стаіць пытаньне аб зьмене існуючых уставаў трэстаў у бок пашырэньня правоў кіраўнікоў прадпрыёмстваў, бо сучасныя ўставы не адпавядаюць умовам гаспадаркі і толькі пры зьмене ўставаў магчыма будзе даказаць аб сапраўднай рацыяналізацыі і патаненьні апарату трэстаў. Рахункаводны апарат усёй прамысловасьці нізкі па якасьці і абыходзіцца дзяржаве ў 750.000 рублёў. Кожнаму вядома, што ў нашым сацыялістычным будаўніцтве павінен быць добры вучот, у зьвязку з чым стаіцца пытаньне аб якасным палепшаньні рахункаводнага апарату, дзеля чаго пры БДУ арганізаваны вышэйшыя бухгальтарскія курсы, якія падрыхтуюць новы кадр вучотных працаўнікоў. Акрамя гэтага трэба зрабіць арганізацыйныя зьмены ў вучотным апараце прамысловасьці, шляхам яго спрашчэньня і ўтаненьня, з далейшым вывучэньнем, а не мэханічным скарачэньнем, як гэта робіцца цяпер.

Далей тав. Элькінд спыняецца на апараце Цэнтрасьпірту ў сэнсе яго рацыяналізацыі. Таксама закрануў пытаньне аб Цэнтраземкладзе, які парушыў лінію партыі ў задаваленьні вёскі машынамі, на якія заможнае сялянства атрымлівала больш крэдытаў, чым бедната.

НК РСІ праведзена вялікая праца па скарачэньню штатаў і наогул спрашчэньня апарату. Напрыклад, апарат дзяржстраху скарочан на 33 проц., апарат на мытніцы на 30 проц. і г. д.

Банкаўскі апарат ня толькі трэба спрасьціць, але скараціць лік самі банкаў, якіх цяпер налічваецца—29. У Бабруйску ўжо ліквідаваны камунальны банк і зусім гэта не адбілася на гаспадарцы акругі, потым скарочаны розныя прадстаўніцтвы з 102 да 48, якія абыходзіліся ў 1.200.000 руб. Таксама рэалізавана каапэрацыйная сець. Такім чынам дзяржаўны і гаспадарчы апараты патанены прыблізна на 4 з паловай мілёнаў руб.

Скарачэньне адм.-гаспадарчых выдаткаў на 20 проц. лепш ідзе па лініі дзяржаўнага бюджэту, дзе выдаткі скарочаны на 19,4 проц., амаль што выканана, гэта дасьць эканоміі каля 1.000.000 руб.

Па лініі мясцовага бюджэту скарачэньне ідзе ня зусім добра. Толькі адзін Бабруйск правёў скарачэньне да 18 проц., а ёсьць гэткія акругі, дзе зьніжэньне зроблена на 0,1 проц. На трэстах зьніжэньне даходзіць да 26 проц.

У заключэньне тав. Элькінд сказаў: што рацыяналізацыя апарату будзе мець яшчэ большы посьпех, калі ў гэтай працы будзе выяўлена больш ініцыятывы з боку саміх кіраўнікоў, якім на дапамогу прыдзе ЦКК РСІ, бяручы курс на большага арганізатара справы рацыяналізацыі пры ўдзеле саміх устаноў і кіраўнікоў, а таксама партыйных і прафэсыянальных арганізацый.

Як мы стварылі „Наркамздраў“.

(Успаміны).

Уноч на 25 кастрычніка 1917 г. я атрымаў загад ад Вайсковага Рэвалюцыйнага Камітэту Петраградзкага Савету за подпісам т. Падвойскага тэрмінова прыступіць да „рэарганізацыі ўсёй мэдыка-санітарнай справы ў рэспубліцы“. Так горда гучаў гэты гістарычны дакумант. Напэўна, прыняцца адразу за гэткую вялізарную праграму нельга было. Яшчэ ня сьціхлі бойкі за ўладу, прыходзілася са зброяй у руках адбіваць Краснова ад Ленінграду і бароцца проці юнкэраў у самым горадзе, а галоўнае—ня было людзей, з якімі было-б магчыма працаваць. Становішча з мэдыцынскай дапамогай Чырвонай арміі было самае дрэннае. Эвакуацыя хворых і першая дапамога мелі самы бязладны характар. Усё гэта нагоршвалася яшчэ і тым, што ленінградзкія бальніцы з вялікімі цяжкасьцямі прымалі хворых чырвонагвардзейцаў і часта прыходзілася пагражаць узброенай сілай, каб дамагчыся рэальных вынікаў. Рабочыя масы і тут праявілі сваю самадзейнасьць. Самай першай санітарнай ячэйкай у Ленінградзе быў пралетарскі Чырвоны Крыж, які арганізаваўся ў Выбарскім раёне; на чале яго стаялі т. т. Караваеў і Фартунатава. Самая назва — Пралетарскі Чырвоны Крыж—гаворыць за тое, што гэта арганізацыя ня мела нічога супольнага з Расейскім Таварыствам Чырвонага Крыжу, якое ў той час заняло да Смольнага няпрыхільную пазіцыю і было бязумоўна варожа і бескарысна.

Мэдыцынскія працаўнікі, якія адклікаліся на наш заклік, налічваліся адзінкамі. У лік гэтых адзінак, якія прыйшлі ў тую ноч у Смольны, былі: ваенны доктар Балонаў і сястра міласэрдзя Сокалава—абодвы беспартыйныя. Першай санітарнай арганізацыяй, з якой мы ўжо гаварылі афіцыйна, уноч на 25 кастрычніка быў мэдыка-санітарны аддзел УЦВК першага скліканьня. На чале аддзелу стаяў вайсковы ўрач Новікаў, але фактычна аддзелам кіравала меншавіцкая група ўрачоў. На нашу прапанову працаваць з намі быў атрыманы горды адказ, што з гвалтаўнікамі ў іх няма нічога супольнага. Нічога больш не заставалася, як зьвярнуцца да Пралетарскага Чырвонага Крыжу і прывесьці ў парадак невялікія запасы тых матар'яльных сродкаў, якія ў яго былі.

Мае спробы ў наступныя дні склікаць пасяджэньне з прадстаўнікамі ўсіх найбольш важных адміністрацыйных мэдыка-санітарных устаноў Петраграду ня мелі посьпеху. Прышоў толькі старшыня Санітарнага Савету Петраградзкай Гарадзкой Думы д-р Багародзіцкі і на гэтым справа скончылася. Пастаў нейкі час паступовага, павольнага накапленьня нашых мэдыцынскіх сіл вакол Смольнага.

Задачы, якія сталі ў той час перад намі, галоўным чынам, былі наступныя два моманты: бездакладная практычная дапамога Чырвонай гвардыі і афармленьне аховы здароўя ва ўсерасейскім маштабе.

Памалу стала арганізоўвацца невялікая група бальшавікоў - дактароў: гэта былі т. т.—В. М. Бонч-Бруевіч, А. Н. Вінакураў, С. І. Міцкевіч, С. І. Вэгер і ў той час левы інтэрнацыяналіст Вячаслоў.

Непасрэдна ў Смольным першы час працавалі ўрачы Глезэр і Бэркoвіч. Пры дапамозе т. т. Сокалавай і Баланова быў арганізаваны ў Смольным і першы наш Чырвоны лазарэт са сталымі койкамі і амбуляторыяй.

Дастаўку мэдыкамэнтаў і перавязачных сродкаў узяў на сябе Пралетарскі Чырвоны Крыж, які дзесьці захапіў рэвалюцыйным парадкам аптэчны склад, адкуль ён досыць доўга карыстаўся ўсім неабходным.

Вельмі добрую паслугу аказаў нам Чырвоны Крыж, перадаўшы ў наша распараджэньне, як рэвалюцыйны трафэй, санітарную аўтакалёну. Аўтамабілі былі якраз да рэчы, бо толькі пры іх дапамозе мы маглі наладзіць эвакуацыю хворых і параненых з баявой лініі. За права ўладаньня гэтай аўтакалёнай нам прышлося паспрачацца з адной вельмі цікавай і характэрнай да таго часу арганізацыяй—Цэнтральным Камітэтам хуткай дапамогі.

Нашыя ворагі любяць часта грунтавацца на тым, што мэдыцына - апалітычна і г. д., але заўсёды забываюць надзвычайныя выпадкі з практыкі нашай барацьбы.

Па нашых практычных меркаваньнях нам не хацелася парываць з імі дачыненьняў і мы дагаварыліся, што калёна будзе знаходзіцца ў распараджэньні Смольнага. Тут неабходна адзначыць надзвычайна самаахвярную працу санітарак, якія на перадавой лініі пад кулямі аказвалі першую дапамогу нашым байцам раней, чым пасадзіць апошніх на аўтамабілі.

У хуткім часе вам прышлося спаткацца з забастоўкай аптэчных служачых, якая пачалася яшчэ пры Часовым Урадзе. Мне было даручана ад імя Ваенна-Рэвалюцыйнага Камітэту ўвайсьці ў перагаворы з забастовачным Камітэтам, прадстаўніком якога быў т. Кунэрман. Апошні досыць ахвотна пачаў з намі дагаварвацца. Я падкрэсьліваю ахвот а, бо ў той час Смольны быў страхацьцём і нават наведваньне яго лічылася для старонніх грамадзян няпрычайным, гэраічным актам. Тут у першы раз мэдыка-санітарны аддзел паказаў свой твар у палітыцы аховы здароўя. Па яго дакладзе Ваенна-Рэвалюцыйны Камітэт загрозіў, каб аптэкі перайшлі ў распараджэньне дзяржавы, але аптэкаўласьнікі на выконваюць усіх патрабаваньняў забастоўшчыкаў. Мы хацелі бяз усякіх умоў іх мунiцыпалізаваць, але спаткалі супраціўленьне з боку фармацэўтаў, якія ў той час ня вельмі верылі ў моцнасьць бальшавіцкага ўраду. Трэба было бачыць спалоханыя твары тых аптэчных гаспадароў, якіх пад канвоем прыводзілі ў Смольны, як непадначаліўшыхся рэвалюцыйнаму загаду. У выніку—аптэкаўласьнікі ўступілі і толькі адну аптэку на Таргoвай вуліцы прышлося часова муніцыпалізаваць.

На шэрагу нарад, якія мы наладзілі з нашай групай дактароў-бальшавікоў, высьветлілася, што чакаць з афармленьнем агульнарасейскай арганізацыі аховы здароўя нельга і трэба хутчэй прыступіць да «захвату» урачэбных кіраўніцтваў ранейшых міністэрстваў.

У кіраўніцтве ранейшага галоўнага ўрачэбнага інспэктара пры Народным Камісарыяце Ўнутраных Спраў была складзена трой-калегія ў складзе т. т. Вінакурава, Міцкевіча, інж. Вэгэра. Такія самыя тройкі былі выдзелены ў Наркамшляху—я, Вячэсоў Галавінскі і Народны Камісарыят Апекі.

Для пагоджаньня працы ўсіх гэтых троек быў арганізаваны савет урачэбных калегій, старшынёй якога быў Вінакураў. Сакратаром была Н. М. Сазонава. Спазьнілася справа з гасоўным санітарным кіраўніцтвам. Толькі 7-XII быў выданы дэкрэт Саўнаркому, у якім у першы раз упаміналася аб савеце ўрачэбных калегій, як органу, на які ўскладаецца выдзяленьне калегіі для загадваньня галоўным ваенна-санітарным кіраўніцтвам. У склад гэтай калегіі ўваходзілі тыя самыя асобы.

У галоўным санітарным кіраўніцтве мы засталі апарат не зруйнаваным, але сабатаж быў вялізарны. Нам, групцы ў 4 асобы, прышлося змагацца з ідэёвымі поглядамі старых, добра арганізаваных чыноўнікаў. У кіраўніцтве галоўнага ўрачэбнага інспэктара быў зусім іншы малюнак. Тут нібы ўсе памёрлі і ўцяклі ад ворага. Нават атрамант вылілі і пахавалі асадкі.

К першым чыслам лістапада адносяцца і нашы перагаворы з т. Леніным аб стварэньні камітэту па ахове народнага здароўя, які павінен быў зьявіцца цэнтральным органам па кіраваньні мэдыка-санітарнай справай у рэспубліцы. Яго парады ляглі ў аснову ўсёй нашай далейшай працы. Першая парада яго была - не сьпяшацца з афармленьнем у Народны Камісарыят Аховы Здароўя.

— Спачатку,—гаварыў ён,—дакажэце на практыцы рабочым, што ідэя Народнага Камісарыяту Аховы Здароўя мэтазгодна, пастаўце справу так, каб самі рабочыя загаварылі аб стварэньні камісарыяту, і толькі пасьля гэтага дамагайцеся заканадаўчага акту.

Другая парада сабраць вакол сябе пралетарска-настроеных дактароў, нераламаць рэакцыйную частку пірагоўскага таварыства дактароў і рэвалюцыйную меншасьць гэтага таварыства скарыстаць для лекавальна-санітарнага будаўніцтва.

Трэцяя парада—гэта стварыць пры саветах рабочых, сялянскіх і савецкіх дэпутатаў мэдыка-санітарныя аддзелы з шырокім удзелам у іх рабочых і сялян.

Вось у асноўным тая праграма, якую пакідаў Уладзімір Ільліч у першыя дні Кастрычніка, на грунце якой і пачала будавацца савецкая мэдыцына.

Барсукоў.

Злачынства д-ра Львовіча суд прызнаў службовым.

(Да забойства тав. Апанскага).

4-га лістапада ўвечары і 5-га да другой гадзіны дня заля Менскага акруговага суду была перапоўнена. Ішоў перагляд справы д-ра Львовіча.

Пратэст пракурора на прыгавар Менскага акруговага суду аказаўся не беспадстаўным. Пры пераглядзе справы Львовіча ў Вярхоўным Судзе БССР высьветлена, што ён зрабіў службовае злачынства, адмовіўшыся даць дапамогу пакалечаным пры крушэньні аўта-дрэзіны.

Д-р Львовіч зрабіў злачынства, будучы пры выкананьні абавязкаў доктара дому адпачынку.

Ведаючы аб няшчасьці з неаднакратных паведамленьняў, ён наўмысьля адмовіўся даць мэдыцынскую дапамогу.

Замест дапамогі, Львовіч не пераставаў спацыраваць па плятформе ў Ждановічах разам з жонкаю, ня гледзячы аб паўторныя паведамленьні аб няшчасьці.

Д-р Львовіч зрабіў службовае злачынства, якое прадугледжана 107 артыкулам крым. кодэксу з карнай санкцыяй па 1 часьці 105 арт. кр. код.

Кіруючыся гэтым, Вярхоўны Суд БССР прыгаварыў Львовіча на 5 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем. Звыш таго, Львовіч пазбаўлен права займацца доктарствам у працягу 5 год па адбыцьці кары.

Прыгавор канчатковы і абскарджаньню не падлягае.

С. Азерскі.

„Зав“ распараджаецца, як яму падабаецца.

(Нова-Барысаў).

На пабудове новай ф-кі «Чырвоная Бярэзіна» у Нова-Барысаве працавала рабочых (падзённых) чалавек 20-25. Упаўнаважанаму Барысаўскага аддзяленьня „Белгосстроя“ Левіну—Шчырыну захацелася чамусьці звольніць некаторых асоб.

Рана, пакуль яшчэ не стапавіліся на працу, ён выдаў некаторым асобам, (якія падабаліся яму) такія талончыкі, што яны маюць права працаваць, а апошнія «идите да хаты».

Вы спытаеце: «чаму ён звольніў цэлых 16 чал.».—Мы ня ведаем. Матывіроўка Левіна-Шчырына—«нет, работы».

Пагледзім ці праўда гэта. Рана звольнілі 16 чал., а пасьля поўдня ўзялі зноў чалавек 8. Ну ўсё з гора напалам, але сярод звольненых былі члены саюзу, а сярод тых, якіх узноў узялі, ніаднаго.

Абіда.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.
1-я Дзяржаўная друкарня.